ПАСПЯХОВАЯ ЖАНЧЫНА СТАЛА МАЦІ-ЗЯЗЮЛЯЙ 6

КАГО ВЫРАСЦІЛА САВЕЦКАЕ ДЗІЦЯЧАЕ КІНО? 8–9

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

23 МАЯ 2020 г. СУБОТА № 99 (29213)

ЦЫТАТА ДНЯ

Ігар КАРПЕНКА, міністр адукацыі:

«Школа выконвае ўскладзеную на яе функцыю, але гэта не выключае адказнасці бацькоў за адукацыю свайго дзіцяці. Нельга ўспрымаць адукацыю як нейкую паслугу, якую мы аказваем з пункту гледжання рынкавых механізмаў. Настаўнік можа выкласціся і на 150 %, але калі дзіця не захоча прыкласці нейкія намаганні, каб асвоіць матэрыял, — нічога не адбудзецца. Вучоба — гэта сур'ёзная і адказная праца. Трэба мець сілу волі, быць арганізаваным, сабраным. Так, школа павінна стварыць умовы, але не замяняць бацькоў».

КАРАТКА

- **Беларусь далучылася да Маракешскай дамовы.**
- Ацяпленне ў бальніцах, дзіцячых садках і школах Мінска пачнуць адключаць 26 мая.
- **Міністэрства адукацыі змяніла тэрміны правядзення ЦТ.**
- МАРГ удакладніла рэгуляванне цэн на дэзынфіцыруючыя сродкі і маскі.
- **У Беларусі рыхтуюць новыя выданні Чырвонай і Чорнай кніг.**
- Першая ў свеце плывучая АЭС уведзена ў эксплуатацыю на Чукотцы.

- **У Беларусі за пяць гадоў газіфікавана 586 сельскіх населеных пунктаў.**
- Выстаўка «Белагра-2020» пераносіцца на 1—5 верасня.

ISSN 1990 - 763X

«Добра было б, калі б усе дзяржавы ўзялі і адмянілі войны»

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

Фота БелТА.

Яшчэ старажытныя рымляне ведалі: хочаш міру, рыхтуйся да вайны. А Напалеон пазней сказаў: народ, які не хоча карміць сваю армію, будзе карміць чужую. Мірная Беларусь далёкая ад імперскіх амбіцый, але і сябе ў крыўду даваць не будзе.

Гэта яшчэ раз пацвердзілася падчас наведвання Прэзідэнтам Беларусі Аляксандрам Лукашэнкам вопытна-выпрабавальнага ўчастка навукова-вытворчага таварыства з абмежаванай адказнасцю «АКБ ТСП» у Мачулішчах. Першае, што адзначыў беларускі лідар пасля прылёту, — ёсць шэраг пытанняў, перш за ўсё па выкананні праграмы развіцця ракетнай вытворчасці.

«Добра было б, калі б усе дзяржавы ўзялі і адмянілі войны. Можа, дажывём, але пакуль яшчэ ніхто не адмяняе войны, нягледзячы на рознага роду пандэміі, эпідэміі, істэрыі. На жаль, да вайны прыходзіцца рыхтавацца ў мірны час. Нікуды не дзенешся: калі не будзеш рыхтавацца (не дай бог, вядома) да вайны зараз, то будзеш пажынаць горкія плады потым», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

Прэзідэнт падкрэсліў, што стратэгічная задача — у выпадку пагрозы нанесці непрымальны ўрон праціўніку, і гэта краіна мусіць дэманстраваць.

СТАР. 2

Зорка для «Кацюшы»

На выставачнай пляцоўцы ваеннай тэхнікі каля Кургана Славы ідзе мантаж пастамента пад легендарную «Кацюшу» — рарытэт Вялікай Айчыннай вайны. Гэты праект рэалізуецца пры ўдзеле Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

На слыху!

«БОЛЬШАСЦЬ ПАЦЫЕНТАЎ ДЫЯГНАЗ УСПРЫМАЮЦЬ АДЭКВАТНА»

Як працуюць выязныя брыгады, што лечаць пацыентаў з COVID-19 дома

З канца красавіка пацыентаў, хворых на каранавірусную інфекцыю ў лёгкай і бессімптомнай форме, лечаць амбулаторна. Медыцынскую дапамогу ім аказваюць урачы паліклінік, у тым ліку выязныя брыгады, або так званыя кантактныя групы. Як змянілася работа паліклінік, і каму ўжо робяць экспрэс-тэсты; як працуюць медыкі, якія штодзень выязджаюць на візіты да пацыентаў, хворых на каранавірус; як мясцовыя жыхары шыюць маскі, каб дапамагчы ўрачам, а тыя, у сваю чаргу, гатовы змяніць на час спецыялізацыю і дапамагаць калегам у барацьбе з інфекцыяй, мы даведаліся, пабываўшы ў 11-й гарадской паліклініцы Мінска.

СТАР. 4

Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

«Добра было б, калі б усе дзяржавы ўзялі і адмянілі войны»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

«Каб тыя, хто, не дай бог, уздумае з намі ваяваць, разумелі, што мы можам адказаць і адкажам годна. ***Самы лепшы адказ з пункту гледжання ўзбраенняў на сённяшні дзень — гэта ракеты, высокадакладная зброя. І ў сілу таго, што наша краіна лясістабалоцістая (гэта заўсёды давала нам перавагу), мы сваю армію прыстасоўваем да барацьбы і ў гэтых умовах»,*** — адзначыў Прэзідэнт.

Ён падкрэсліў, што міралюбівая Беларусь не збіраецца займацца глабалізмам, захопліваць чужыя дзяржавы, — у гэтым няма ні магчымасці, ні неабходнасці. Падобнай цікавасці да нас няма і з боку іншых краін.

«Таму міжкантынентальныя балістычныя ракеты з ядзернай зброяй нам няма сэнсу распрацоўваць, мы і не можам гэта рабіць — гэта вельмі дарагая рэч. Нам гэта ў прынцыпе на сённяшні дзень і не трэба, мы павінны арыентавацца на тое, што магчыма. Таму мы ствараем адпаведныя ракетныя вытворчасці. Я не скідаю з рахунку стралковую зброю, бранетанкавую тэхніку, сродкі ППА — мы гэта ўсё паказалі на парадзе», — нагадаў Аляксандр Лукашэнка.

Праграма развіцця ракетнай вытворчасці ў Беларусі рэалізуецца ў 2017—2020 гадах, яна стала працягам праграмы 2011—2016 гадоў. Мэты ў яе дзве: знізіць залежнасць краіны ад закупак дарагога ўзбраення за мяжой і стварыць айчынныя ўзоры ракетнай тэхнікі, канкурэнтаздольнай на сусветным рынку. Заказчыкі — Дзяржкамваенпрам і Нацыянальная акадэмія навук. У праграме ўдзельнічаюць арганізацыі дзяржаўнай і прыватнай формаў уласнасці.

Хутка і далёка

Ракеты, якія цяпер знаходзяцца на ўзбраенні ў Беларусі, маюць далёкасць паражэння дзвесце кіламетраў. У нашай краіне асвоена зборка кітайскіх ракет — «трохсотак», але пастаўлена задача распрацаваць уласнае ўзбраенне такога кшталту. Ужо ў верасні чакаюць іх выпрабаванняў, але затрымка за палігонамі, на якіх падобныя выпрабаванні можна правесці. У Беларусі такіх няма: нашы дазваляюць стрэліць на далёкасць не больш за трыццаць кіламетраў. Прэзідэнт падрабязна пацікавіўся ўмовамі ў кожнай магчымай краіне, у тым ліку ў найбліжэйшых суседзяў.

Аляксандр Лукашэнка выказаў гатоўнасць на ўзроўні лідараў краін дамовіцца на правядзенне выпрабаванняў, напрыклад, у КНР.

«Нам патрэбная свая ракета. Мы не можам ствараць зброю, па якой будзем залежаць ад іншых краін. Ніхто гэту зброю проста так не дасць. Гэта нам яшчэ пашанцавала дамовіцца з кітайцамі. Але далей залежнасці гэтай быць не павінна», — абазначыў задачу Прэзідэнт.

Каб выратаваць экіпаж

«АКБ ТСП» — інавацыйнае прадпрыемства, заснаванае ў 2002 годзе. Асноўнымі кірункамі дзейнасці з'яўляюцца: глыбокая мадэрнізацыя існуючых узораў узбраення і ваеннай тэхнікі, правядзенне навукова-тэхнічных і ваенна-навуковых даследаванняў, распрацоўка і серыйная вытворчасць новых сістэм узбраення і іх элементаў і прылад падвойнага прызначэння, а таксама распрацоўка і вытворчасць апаратна-праграмных сродкаў для сістэм кіравання войскамі і зброяй.

Аляксандру Лукашэнку прадэманстравалі найноўшае ваеннае беларускае ўзбраенне, сярод якога — рэактыўная сістэма залпавага агню, зенітна-ракетныя комплексы і рабатызаваныя тэхніка, ракетнае ўзбраенне.

Дырэктар аднаго з распрацоўшчыкаў ваеннай тэхнікі — ТАА «БСВТ — Новыя тэхналогіі» — Філіп Баранаў, паведаміў, што прымяненне рэактыўнай сістэмы залпавага агню (РСЗА) «Флейта» на базе лёгкабраніраванага аўтамабіля істотна павышае жывучасць экіпажа, а таксама дазваляе выкарыстоўваць авіяцыйныя ракеты ў наземнай тэхніцы. Дзякуючы сучаснай сістэме інфарматызацыі час падрыхтоўкі пуску складае менш за хвіліну. Прымяненне падобных комплексаў на рабатызаваных дыстанцыйна кіруемых комплексах таксама, па словах дырэктара, дазваляе «захаваць асабовы склад».

Адна з асноўных надзённых тэм зараз — гэта барацьба з маламернымі дыстанцыйнымі кіруемымі беспілотнымі апаратамі, растлумачыў дырэктар прадпрыемства.

«Для супрацьдзеяння ім створаны рабатызаваны комплекс «Берсерк». З выкарыстаннем двух кулямётаў ГШГ калібрам 7,62 міліметра, дзякуючы высокастрэльнасці (12 тысяч стрэлаў у хвіліну) ён можа эфектыўна паражаць маламерныя беспілотныя лятальныя апараты на адлегласці да аднаго кіламетра. А выкарыстанне сучасных метадаў апрацоўкі выявы навядзення на цэль дазваляе істотна знізіць нагрузку на аператара», — расказаў Філіп Баранаў.

«БСВТ — Новыя тэхналогіі» таксама рамантуе авіяцыйныя кіруемыя ракеты Р-73, Р-60 і Р-27. За мінулы год адрамантавана 110 авіяцыйных кіруемых ракет Р-27, паведаміў кіраўнік прадпрыемства.

Комплекс «Паланэз-М» прадставіў дырэктар «Завода дакладнай электрамеханікі» Юрый Чорны.

«За апошнія пяць гадоў завод дакладнай электрамеханікі як галаўное прадпрыемства комплексаў РСЗА буйнога калібру ў кааперацыі з іншымі прадпрыемствамі ваенна-прамысловага комплексу распрацавала лінейку комплексаў «Паланэз», — расказаў ён. — Усе яны прайшлі поўны цыкл распрацоўкі і правядзення баявых стрэльбаў на палігонах Беларусі і замежных дзяржаў».

Па ацэнцы еўрапейскіх і азіяцкіх экспертаў, «Паланэз-М», які выкарыстоўвае два тыпы ракет — з далёкасцю паражэння да 200 і да 300 кіламетраў, з'яўляецца адным з найлепшых у сваім класе, праінфармаваў кіраўнік прадпрыемства.

«Акрамя таго, у гэтым комплексе закладзены вельмі вялікі мадэрнізацыйны патэнцыял, які невычарпальны на найбліжэйшыя 20 гадоў, — дадаў ён. — Трэцяя асаблівасць згаданага комплексу прастата і зручнасць эксплуатацыі».

На мірную і добрую памяць

Падчас вывучэння ўзораў беларускай тэхнікі Аляксандр Лукашэнка пакінуў подпіс на першай зенітнай кіруемай ракеце беларускай вытворчасці, запуск якой адбыўся сёлета 19 лютага — ЗРК «Бук». Мадэль гэтага комплексу была падорана кіраўніку дзяржавы на памяць пра наведванне вопытна-выпрабавальнага ўчастка «АКБ ТСП» у Мачулішчах.

«Самае галоўнае, мы не павінны спыняцца, — падсумаваў кіраўнік дзяржавы. — ***Калі ўжо пайшоў — ідзі! Грошы, канешне, трэба лічыць, без грошай, без памылак, вядома, гэта не абыходзіцца, але па-мужчынску трэба працаваць — калі ўжо намецілі, значыць, трэба гэта рэалізоўваць».***

Варвара МАРОЗАВА, Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА. Фота БелТА.

❍ Каментарый у тэму

Ракетабудаванне — не затратная для дзяржавы галіна, заявіў пазней журналістам **старшыня Дзяржкамваенпрама Раман ГАЛОЎЧАНКА.** Ён адзначыў, што выдаткі дзяржавы на развіццё ракетабудаўнічай галіны ўжо шматразова акупіліся за кошт замежных кантрактаў на пастаўку гэтага ўзбраення.

Па словах кіраўніка ведамства, рынкі збыту знаходзяцца па ўсім свеце, асноўны рэгіён — Блізкі Усход, Афрыка, Паўднёва-Усходняя Азія. Гэта краіны, якія не маюць уласнай вытворчасці, альбо для якіх занадта дарагія заходнія ўзоры, дадаў ён.

Дасягнутыя дагэтуль вынікі праграмы Раман Галоўчанка назваў значнымі.

«Па-першае, ракетны комплекс «Паланэз-М» — далёкасць яго выкарыстання павялічаная з 200 да 300 кіламетраў. Такім чынам, зона паражэння таксама павялічылася да 300 кіламетраў. Вядзецца работа над стварэннем новых тыпаў боепрыпасаў да гэтай сістэмы. Работа вельмі складаная. Гэта практычна ўжо аэракасмічныя тэхналогіі, але мы на правільным шляху, і сённяшняя размова гэта пацвердзіла», — сказаў кіраўнік ведамства.

Побач з ракетным комплексам «Паланэз-М» можна паставіць комплекс зенітна-ракетны «Бук-М3», дадаў старшыня Дзяржкамваенпрама.

«Як мы ўжо не раз казалі, мы адышлі ад паняцця мадэрнізацыі савецкага і расійскага комплексу — гэта першы цалкам беларускі зенітна-ракетны комплекс, — падкрэсліў ён. — Галоўнае, чаго яму не хапала, — уласнай зенітнай кіруемай ракеты. Цяпер ідзе яе дапрацоўка».

За два апошнія гады беларускія распрацоўшчыкі ракет перайшлі ад канцэптаў і мадэляў да рэальна дзеючых узораў, паведаміў Раман Галоўчанка.

«Зараз самае галоўнае — вызначыцца з вектарам далейшага развіцця. Думаю, у найбліжэйшы час мы павінны (і Прэзідэнт таксама пра гэта казаў) шчыльна заняцца самымі складанымі і дарагімі рэчамі — палівам, выбуховым рэчывам баявой часткі. Тут мы пакуль знаходзімся ў пачатковай стадыі, але развіваемся дастаткова хутка. Сёння некаторыя беларускія распрацоўкі выбуховых рэчываў і паліўных энергетычных матэрыялаў былі прадстаўлены. Думаю, гэта вектар будучага развіцця, над якім будзем працаваць у наступнай пяцігодцы больш шчыльна», — сказаў ён.

Блізкая ўлада

ПРЫЁМЫ ГРАМАДЗЯН, ЯК ЛАКМУСАВАЯ ПАПЕРА

З іх дапамогай выяўляюцца праблемы людзей

Шаснаццаць чалавек выслухаў намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Андрэй КУНЦЭВІЧ падчас прыёму грамадзян у Крупскім раёне. Прычым не толькі мясцовых жыхароў, але і з іншых раёнаў Міншчыны, Брэсцкай, Гродзенскай і Магілёўскай абласцей. Заяўнікі агучылі пытанні самай рознай тэматыкі.

Фота БелТА.

Жыхар аграгарадка Хацюхова Крупскага раёна Міхаіл Міхайлавіч прасіў пасадзейнічаць у рэгістрацыі дома. Мясцовыя ўлады не даюць на гэта дазволу, спасылаючыся на тое, што ён парушыў заканадаўства. Сапраўды, мужчына пабудаваў жыллё на самавольна занятым зямельным участку. Дом узведзены з бярвёнаў, якія ён перавёз з іншага населенага пункта, на адлегласці два метры ад мяжы суседняга ўчастка. Па дзеючым заканадаўстве пабудова павінна быць за тры метры ад мяжы. Акрамя таго, дом стаіць на старым фундаменце большага памеру, чым сам, што з'яўляецца парушэннем прадугледжаных нормаў. Таму зарэгістраваць памяшканне нельга, яно падлягае зносу.

Разам з тым грамадзяніну прапанавалі выхад з сітуацыі на законных падставах. У прыватнасці, прыбраць пабудову, паколькі цяпер яна нежылая. Сельвыканкам выказаў гатоўнасць аказаць садзейнічанне. Мясцовыя ўлады неаднаразова звярталіся па гэтым пытанні ў вышэйстаячыя арганізацыі з запытам: ці можна дазволіць узаконіць дом у выглядзе выключэння. Але адказ адмоўны: на заканадаўчым узроўні нельга. Выйсце з сітуацыі ёсць: неабходна перанесці пабудову і ўзаконіць граніцы ўчастка. Аднак Міхаіла Міхайлавіча такая прапанова не задавальняе — вялікія выдаткі.

Іншых варыянтаў у гэтай сітуацыі няма, прыйшоў да высновы Андрэй Кунцэвіч, выслухаўшы меркаванне ўсіх зацікаўленых бакоў. Ён даручыў старшыні райвыканкама Анатолю Козелу, каб спецыялісты будаўнічай галіны пракансультавалі мужчыну, як перанесці дом з найменшымі стратамі.

Дом Вольгі Сямёнаўны на вуліцы Калініна ў Крупках мяжуе са стадыёнам мясцовай гімназіі. Тут праходзяць футбольныя матчы. І мяч часта трапляе на тэрыторыю яе домаўладання. Дзеці, каб яго забраць, лазяць цераз плот, топчуць градыі. Жанчына звярталася ў пракуратуру, райвыканкам. Ёй пайшлі насустрач і ўладкавалі паверх агароджы металічную сетку вышынёй 4,5 метра. Аднак Вольга Сямёнаўна стаіць на тым, каб установа замяніла цалкам стары плот. Андрэй Кунцэвіч даручыў мясцовым уладам яго адрамантаваць. Агароджа будзе заменена да пачатку новага навучальнага года, паабяцаў намеснік старшыні райвыканкама Андрэй Вараб'ёў.

Таццяна Іларыёнаўна з вёскі Ламское Крупскага раёна расказала, што сястра яе бацькі, якая нядаўна памерла, пакінула ёй завяшчанне на суму 2500 рублёў. Аднак гэтыя грошы яна не можа атрымаць, паколькі ў дакументе няправільна пазначана яе прозвішча. Акрамя таго, жанчына не можа сабраць усе неабходныя дакументы. Першую праблему ўдалося вырашыць праз суд. А вось з другой не ўсё так проста: пенсіянерцы трэба пацвердзіць сваяцкія адносіны з памерлай цёткай і факт смерці бацькі. Андрэй Кунцэвіч звярнуўся да натарыуса натарыяльнай канторы Крупскага раёна Галіны Макарэвіч з просьбай дапамагчы разабрацца ў сітуацыі і літаральна распісаць кожны крок, куды звярнуцца і што зрабіць заяўніцы.

Віктар Іванавіч з Крупак прасіў пасадзейнічаць у пастаяннай рэгістрацыі ў садовым таварыстве, Алена Уладзіміраўна — у пошуках сына, які прапаў без вестак у 2017 годзе, Сяргей Аляксандравіч з Валожына — у выдзяленні зямельнага ўчастка для будаўніцтва жылых дамоў для работнікаў сялянскай (фермерскай) гаспадаркі і домікаў для размяшчэння турыстаў.

Андрэй Кунцэвіч уважліва выслухаў усіх і пастараўся знайсці рашэнне, якое б задаволіла ўсе зацікаўленыя бакі.

На думку намесніка кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта, спецыфіка гэтага прыёму дастаткова традыцыйная. Як правіла, у межах прыёмаў заўсёды агучваецца нямала пытанняў, якія датычацца зямельных спрэчак, шмат якія звязаны з судовымі рашэннямі. Па кожным з іх ідуць адпаведныя судовыя разборы, і людзі абавязкова атрымаюць адказ.

Мясцовыя ўлады, лічыць Андрэй Кунцэвіч, прымаюць адэкватныя меры рэагавання на звароты людзей. «А там, дзе неабходна падключыць рэспубліканскія органы кіравання, я, думаю, мы абавязкова гэта зробім. І скажу так, прыкладзём максімум намаганняў для вырашэння тых праблем, якія паднялі грамадзяне ў Крупках».

— Работа са зваротамі грамадзян, маніторынг сітуацыі на месцах не з'яўляюцца нечым надзвычайным. Гэта пастаянная сістэмная работа Адміністрацыі Прэзідэнта. І мы бачым, што прамыя лініі, прыёмы грамадзян, у тым ліку з выездам у рэгіёны запатрабаваныя людзьмі. Па сутнасці — гэта своеасаблівая лакмусавая папера, якая дазваляе зрабіць высновы аб сітуацыі ў раёне, падыходах мясцовых органаў улады да работы з людзьмі. Акрамя таго, як паказвае практыка, за канкрэтнай асабістай гісторыяй могуць хавацца пытанні, якія патрабуюць сістэмных кіраўніцкіх рашэнняў на рэспубліканскім узроўні. Як прыклад таму, работа па даручэнні Прэзідэнта над новай рэдакцыяй Кодэкса аб адміністрацыйных правапарушэннях, дзе шэраг палажэнняў былі скарэктаваныя з улікам зваротаў грамадзян. Уважлівыя і паважлівыя адносіны да людзей ляжаць у аснове нашай дзяржаўнай палітыкі, а зразумелая, адкрытая сістэма зваротнай сувязі найважнейшы яе элемент», — сказаў напрыканцы журналістам Андрэй Кунцэвіч.

Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.

Парламенцкі дзённік

Наспела неабходнасць

Дэпутаты ратыфікавалі пагадненне, якое паўплывае на кошт тытунёвых вырабаў

Як растлумачыў журналістам член Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па бюджэце і фінансах Сяргей СЦЕЛЬМАШОК, праз рост рынку нелегальнай прадукцыі на тэрыторыі краін — членаў ЕАЭС наспела неабходнасць увядзення індыкатыўнай стаўкі акцызаў на тытунёвую прадукцыю.

Яна будзе ўводзіцца паэтапна да 2024 года ў памеры 35 еўра на тысячу цыгарэт. Пазней кожныя пяць гадоў Савет Еўразійскай эканамічнай камісіі будзе пераглядаць стаўку і вызначаць яе памер. Па словах дэпутата, краіны маюць права адхіляцца ад стаўкі на 20 працэнтаў у той ці іншы бок.

«Любая дзяржава — член саюза можа ініцыяваць перагляд гэтай стаўкі ў залежнасці ад эканамічнай сітуацыі, якая на пэўны момант склалася ў кожнай канкрэтнай краіне», — удакладніў Сяргей Сцельмашок.

Ён падкрэсліў, што з аднаго боку, тытунь — гэта адна з крыніц паступленняў у бюджэт, з іншага — краіна з улікам значнасці гэтай прадукцыі для пэўнага кола насельніцтва стрымлівае цэны на яе. Таму акцыз можа размяркоўвацца паміж спажыўцамі і вытворцамі. Наколькі — вызначыць дзяржава.

Дэпутаты прагаласавалі за прыняцце законапраекта аб ратыфікацыі Пагаднення аб прынцыпах вядзення падатковай палітыкі ў вобласці акцызаў на тытунёвую прадукцыю дзяржаў — членаў Еўразійскага эканамічнага саюза. Ратыфікацыя пагаднення забяспечыць гарманізацыю ставак акцызаў на тытунёвыя вырабы ў рамках ЕАЭС.

Усяго на пасяджэнні другой сесіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі сёмага склікання дэпутаты разгледзелі дзесяць законапраектаў. У прыватнасці, прагаласавалі за магчымасць для беларусаў адкрываць дэпазіты за межамі краіны без дазволу Нацыянальнага банка. Акрамя таго, на заканадаўчым узроўні ўстаноўлена эталонная выява Дзяржаўнага герба Беларусі.

Узяць на кантроль дамы-інтэрнаты

На завяршэнне пасяджэння сесіі **старшыня Палаты прадстаўнікоў Уладзімір АНДРЭЙЧАНКА** адзначыў, што парламентарыі актыўна ўдзельнічаюць у маніторынгу эпідэміялагічнай сітуацыі і барацьбе з каранавірусам, але заклікаў асаблівую ўвагу звярнуць на стацыянарныя ўстановы для пажылых людзей і інвалідаў, якія знаходзяцца на тэрыторыі выбарчых акруг.

«Усяго па краіне іх 153. І людзі ў іх зараз знаходзяцца ў групе павышанай рызыкі. Акрамя таго, 5200 чалавек знаходзяцца ў гэтых дамах-інтэрнатах на пасцельным рэжыме. Канешне, для мінімізацыі распаўсюджвання інфекцыі ў гэтых установах прыняты цэлы шэраг мер: дамы-інтэрнаты пераведзены на поўную ізаляцыю, персанал працуе там вахтавым метадам, ва ўстановах праводзіцца штодзённы медыцынскі кантроль супрацоўнікаў і жыхароў, назапашаны сродкі індывідуальнай аховы, лекі, прадукты харчавання», — канстатаваў Уладзімір Андрэйчанка.

Свой унёсак у аказанне дапамогі робяць і дэпутаты. У прыватнасці, Пастаянная камісія па працы і сацыяльных пытаннях другі месяц вывучае сітуацыю ў інтэрнатах і прымае меры ў вырашэнні праблем. Парламентарыі закупляюць і перадаюць прадукты, засцерагальныя касцюмы, шчыткі і іншыя сродкі. Старшыня Палаты прадстаўнікоў упэўнены, што гэту работу трэба працягваць разам з органамі выканаўчай улады.

«Кожны дэпутат мусіць узяць на кантроль дамы-інтэрнаты, якія знаходзяцца ў яго выбарчай акрузе. Аб гэтым у нас ішла размова і з Прэзідэнтам падчас яго візіту ў Віцебскую вобласць, і ён канкрэтна даручыў, каб кожны дэпутат у сваёй акрузе трымаў на пастаянным кантролі работу гэтых дамоў», — нагадаў спікер ніжняй палаты парламента. Уладзімір Андрэйчанка лічыць, што для дапамогі трэба задзейнічаць магчымасці бізнесу, прадпрыемстваў, грамадскасці, а галоўнае — знаходзіцца ў цесным кантакце з прадстаўнікамі аператыўных штабоў, створаных пры мясцовых выканаўчых і распарадчых органах улады.

Варвара МАРОЗАВА.

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

Пасажырскі самалёт разбіўся ў Пакістане

Самалёт «Пакістанскіх міжнародных авіялініі» разбіўся ў жылым раёне горада Карачы. На борце было 99 пасажыраў і восем членаў экіпажа, паведаміла агенцтва Reuters са спасылкай на прадстаўніка авіякампаніі. Упраўленне грамадзянскай авіяцыі Пакістана ўдакладніла, што гаворка ідзе пра Airbus A320. Па інфармацыі тэлеканала Geo.tv, самалёт ляцеў у Карачы з горада Лахор. Крыніца ва ўпраўленні грамадзянскай авіяцыі Пакістана паведаміла тэлеканалу, што самалёт разбіўся пры заходзе на пасадку. Па звестках Daily Jasarat, крушэнне адбылося за 4 км ад аэрапорта, самалёт упаў на жылыя дамы. Непасрэдна перад катастрофай пілоты паведамілі аб праблемах з выпускам шасі. На кадрах, апублікаваных тэлеканалам Geo.tv, відаць, як над месцам падзення самалёта падымаецца чорны дым. У раён катастрофы былі накіраваны сілы хуткага рэагавання пакістанскай арміі.

Індыя накіруе $133 млн на аднаўленне пасля цыклону

Урад Індыі выдзеліць 10 мільярдаў рупій (каля 133 мільёнаў долараў) на аднаўленне штата Заходняя Бенгалія, пацярпелага ад цыклону «Амфан», паведаміў прэм'ер-міністр Індыі Нарэндра Модзі. Кіраўнік урада наведаў пацярпелы штат, агледзеў з паветра разбурэнні і правёў шэраг сустрэч. «Будуць разгледжаны ўсе пытанні, звязаныя з аднаўленнем і рэканструкцыяй. Мы будзем працаваць разам, каб Бенгалія зноў устала на ногі», — сказаў Модзі на прэс-канферэнцыі з кіраўніком штата Маматай Банерджы. Прэм'ер-міністр таксама абвясціў аб выдзяленні 200 тысяч рупій (каля 2,6 тысячы долараў) сем'ям загінулых падчас цыклону і 50 тысяч рупій (прыкладна 660 долараў) для параненых. Да гэтага галоўны міністр штата Заходняя Бенгалія паведаміла аб 80 загінулых у штаце. Па яе словах, 61 чалавек загінуў у сельскай мясцовасці, 19 чалавек загінулі ў Калькуце. Раней Мамата Банерджы заявіла, што шкода ад цыклону можа скласці больш за трыльён рупій (13,3 мільярда долараў).

Эстонія тэстуе лічбавыя пашпарты імунітэту

Як паведамляе агенцтва Reuters, гэта адзін з першых падобных досведаў у свеце — так краіна шукае спосабы вярнуць людзей на рабочыя месцы пасля змякчэння абмежаванняў, звязаных з каранавірусам. Пашпарт імунітэту ўключае звесткі аб праведзеных тэстах чалавека на каранавірус і дазваляе дзяліцца іх статусам імунітэту з трэцімі бакамі — напрыклад, работадаўцам — праз часовыя QR-коды, атрыманыя пасля лічбавай аўтэнтыфікацыі, растлумачыла Reuters. Пашпарты імунітэту распрацавала няўрадавая арганізацыя Back to Work («Назад да працы»), якая ўключае заснавальнікаў стартапаў Transferwise (служба грашовых пераводаў) і Bolt (сэрвіс заказу таксі). Акрамя таго, у склад Back to Work увайшлі мясцовыя эксперты ў галіне аховы здароўя і прадстаўнікі дзяржавы. Сярод першых кампаній, якія распачалі ўжываць лічбавыя пашпарты імунітэту ў рамках тэсціравання, сталі гатэлі сеткі Radisson і пастаўшчык прадуктаў харчавання PRFoods.

«БОЛЬШАСЦЬ ПАЦЫЕНТАЎ ДЫЯГНАЗ УСПРЫМАЮЦЬ АДЭКВАТНА»

«Мы былі гатовы да розных варыянтаў развіцця падзей»

Днём у рэгістратуры наведвальнікаў няшмат. Перад кабінетамі ўрачоў агульнай практыкі чэргаў таксама няма.

— Да работы з інфіцыраванымі пацыентамі і кантактнымі асобамі, згодна з усімі распараджэннямі Міністэрства аховы здароўя і камітэта па ахове здароўя Мінгарвыканкама, мы пачалі рыхтавацца са студзеня. У сакавіку, калі былі зарэгістраваны першыя пацыенты на тэрыторыі нашага раёна, у нас меўся каардынацыйны план з некалькімі варыянтамі развіцця падзей, і мы былі гатовы да розных сцэнарыяў, — расказвае **галоўны ўрач 11-й гарадской паліклінікі Мінска Ірына БОЛДЫРАВА** *(на фота)*. — У першыя дні з моманту рэгістрацыі першага выпадку

COVID-19 у нашым раёне ў паліклініцы былі раздзелены патокі пацыентаў. Мы выдзелілі асобныя ўваходы для цяжарных жанчын, для пацыентаў з тэмпературай. На ўваходзе ў паліклініку маюцца адпаведныя ўказальнікі. Асобна вылучылі гадзіны прыёму для пацыентаў, якім трэба прайсці прафагляд. Яны прыходзяць праз асобны ўваход, па асобнай лесвіцы ў гадзіны, калі ў паліклініцы найменш наведвальнікаў. На другім паверсе былі вызначаны пэўныя кабінеты для прафілактычнага медагляду. Такім чынам мы мінімізавалі хаджэнне па паліклініцы.

Ірына Болдырава падкрэслівае, што пажылых людзей з хранічнымі захворваннямі, якія раней рэгулярна наведвалі доктара, папрасілі застацца дома. Да іх прыходзілі медыкі, аказвалі дапамогу і выпісвалі рэцэпты. І тут прыйшлася да месца падтрымка ўрачоў-спецыялістаў і сярэдняга медперсаналу, якія дапамагаюць участковай службе.

На першым паверсе паліклінікі арганізаваны пост, дзе дзяжурыць медыцынскі работнік, які бескантактным тэрмометрам вымярае наведвальнікам тэмпературу і ўдакладняе, з якой мэтай яны прыйшлі. Калі пацыент не заўважыў аб'яву, яго накіроўваюць на асобны ўваход, калі прыйшоў з тэмпературай — прапануюць выклікаць урача на дом ці пайсці праз асобны ўваход у інфекцыйны кабінет.

Трэба адзначыць, што з пачатку сакавіка, калі ў Мінску былі выяўлены першыя хворыя з дыягназам COVID-19, планавая медыцынская дапамога была зменшана. У прыватнасці, гэта датычыцца аддзялення дзённага знаходжання і фізіятэрапеўтычнага аддзялення. Яны прымаюць толькі тых, каму тэрмінова неабходны лячэнне і рэабілітацыя.

— Напрыклад, пацыентаў з траўмамі, якія лечацца працяглы час, мы пакінулі дома. Хірургічных пацыентаў аглядалі і рабілі перавязкі таксама дома. Гэта было зроблена, каб мінімізаваць іх кантакты і рызыку заражэння, — тлумачыць галоўны ўрач.

У сваю чаргу некаторых урачоў-спецыялістаў давялося перавесці на аказанне дапамогі каранавірусным хворым. Гэта, напрыклад, урач-тэрапеўт аддзялення дзённага знаходжання, загадчык аддзялення медыцынскай рэабілітацыі, урач-акушэр-гінеколаг і загадчык жаночай кансультацыі, загадчык аддзялення прафілактыкі. Усе яны цяпер, акрамя таго, што аказваюць медыцынскую дапамогу ў межах сваёй кампетэнцыі, вядуць прыём у інфекцыйным кабінеце ці як урачы агульнай практыкі ў тэрапеўтычным аддзяленні. А вось некаторыя ўрачы агульнай практыкі ў сваю чаргу ўвайшлі ў склад кантактных груп, якія выязджаюць на візіты да хворых на каранавірусную інфекцыю.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

— Я вельмі ганаруся сваім калектывам, — прызнаецца Ірына Болдырава. — Урачы-спецыялісты прыходзілі і казалі, што гатовы дапамагаць тэрапіі, інфекцыйнаму кабінету. Ні адзін супрацоўнік не адмовіўся ад работы з пацыентамі з каранавіруснай інфекцыяй.

Усе медыкі, якія працуюць з інфіцыраванымі каранавірусам, атрымліваюць даплаты. Урачы — тысячу рублёў, сярэдні медыцынскі персанал — 500, астатнія работнікі — 300.

— Усе, хто пажадаў дапамагаць інфекцыяністу і ўрачам агульнай практыкі, — супрацоўнікі аддзялення прафілактыкі, жаночай кансультацыі, аддзялення рэабілітацыі, а таксама тэрапія, інфекцыйны кабінет, рэнтгенаддзяленне, дыягнастычная лабараторыя, — атрымалі даплаты. Мы вызначылі гэта адразу, — засяроджвае ўвагу галоўны ўрач.

«У апошнія дні назіраем зніжэнне захваральнасці»

11-я паліклініка абслугоўвае 30 тысяч насельніцтва Ленінскага раёна сталіцы. На момант падрыхтоўкі матэрыялу там было 113 пацыентаў, якія сталі кантактамі першага ўзроўню. Каля 75 чалавек хварэе на каранавірусную інфекцыю ў лёгкай форме — без запалення лёгкіх. 20 пацыентаў маюць пнеўманіі, з іх 10 — «кавідныя». Гэта людзі, якія адмовіліся ад стацыянарнага лячэння і знаходзяцца пад амбулаторным назіраннем ці маюць лёгкія формы, і іх стан дазваляе лячыцца дома.

— 20 пнеўманій на 30 тысяч насельніцтва, якое абслугоўвае паліклініка, — гэта нязначная лічба, тое самае датычыцца і кантактаў першага ўзроўню — гэта вельмі няшмат, — кажа галоўны ўрач.

Пацыенты з прастуднымі захворваннямі, тэмпературай накіроўваюцца ў інфекцыйны кабінет або выклікаюць урача на дом. Калі яшчэ нядаўна штодзень інфекцыяніста наведвала 30—40 чалавек, то зараз пацыентаў стала менш.

— У апошнія дні мы назіраем некаторае зніжэнне захваральнасці. Напрыклад, учора было 38 выклікаў да хворых з тэмпературай — гэта няшмат. Канешне, калі параўноўваць са звычайнымі для мая лічбамі, сёлета ёсць рост захваральнасці, але ён невялікі. Гэтай зімой і вясной увогуле ўсё зрушылася: снежань, студзень, люты і сакавік былі вельмі спакойныя, вялікага наплыву па 100 візітаў у дзень, як некалькі гадоў таму, не было. Рост захваральнасці пачаўся з сярэдзіны красавіка, — канстатуе суразмоўніца.

«Мясцовыя жыхары пашылі 500 масак і перадалі нам»

Медыцынскую дапамогу пацыентам з COVID-19 дома аказваюць тры выязныя брыгады, якія складаюцца з урача і памочніка ўрача. Яны працуюць у тым ліку ў святочныя і выхадныя дні. Кожная група аснашчана пульсаксіметрам, бескантактным тэрмометрам, сродкамі індывідуальнай аховы. Да пацыентаў іх возяць спецыяльна абсталяваныя машыны, у якіх ёсць перагародка ад кіроўцы; транспарт апрацоўваецца дэзсродкамі. Размяркоўвае візіты каардынатар кантактных груп.

— Калі чалавек захварэў, звесткі аб ім перадаюцца ў тэрытарыяльны

Святлана ЯНУШКА і Ангеліна ЦЕХАНОВІЧ.

цэнтр гігіены і эпідэміялогіі. Яго спецыялісты праводзяць эпідрасследаванне і высвятляюць першы і другі ўзроўні кантакту, іх дату, складаюць спісы і дасылаюць у паліклінікі, — тлумачыць, як знаходзяць кантактных асоб, Ірына Болдырава. — Наш каардынатар аналізуе спісы, і адразу ж кантактная група выязджае да гэтага чалавека: бярэ мазок, выдае лісток непрацаздольнасці, запаўняе патрабаванне аб самаізаляцыі, якое мы накіроўваем у РУУС Ленінскага раёна, пакідае памятку аб самаахове. Інфармацыя пра кантактную асобу на ўчастку паведамляецца і ўрачу агульнай практыкі. З першага па сёмы дзень ён тэлефануе пацыенту, удакладняе яго стан. У прыватнасці, цікавіцца тэмпературай, наяўнасцю болю ў горле, задышкі — асноўнымі сімптомамі каранавіруснай інфекцыі. На сёмы дзень зноў выязджае кантактная група, аглядае, працягвае лісток непрацаздольнасці, а інфармацыю аб стане пацыента перадае ўрачу агульнай практыкі. Ён працягвае штодзень тэлефанаваць пацыенту і цікавіцца яго самаадчуваннем. У выпадку пагаршэння стану выязджае зноў-такі кантактная група і прымае рашэнне ў залежнасці ад сітуацыі. На дзясяты дзень у пацыента бяруць экспрэс-тэст такая магчымасць з'явілася з мінулага тыдня. Калі ён адмоўны, мы падаўжаем бальнічны да 14 дзён і закрываем. Калі станоўчы — падаўжаем і працягваем амбулаторнае назіранне.

Кантактная група выязджае да пацыентаў у ахоўным адзенні — супрацьчумных касцюмах, рэспіратарах, шчытках і акулярах. Іх як закуплялі, так і атрымлівалі ў якасці спонсарскай дапамогі, у тым ліку і ад нераўнадушных грамадзян.

— Жыхары дома № 154 па вуліцы Маякоўскага пашылі 500 масак і прынеслі нам. Было нечакана і вельмі прыемна. Мы ўдзячныя гэтым людзям, нават напісалі ім падзяку, — прызнаецца галоўны ўрач.

На сёння ў паліклініцы ёсць месячны запас сродкаў індывідуальнай аховы. Ахоўныя касцюмы, шчыткі, акуляры, а таксама пульсаксіметры і бескантактныя тэрмометры паступалі з Кітая, Расіі, Узбекістана. Бязвыплатную спонсарскую дапамогу аказалі Беларускі саюз жанчын, Беларускі Чырвоны Крыж. І яна працягвае паступаць. Напрыклад, цэнтр нерухомасці гатовы выдзеліць спонсарскую дапамогу ў выглядзе медыцынскіх халатаў, дэзсродкаў, акуляраў, шчыткоў і іншых сродкаў.

— Захворванняў сярод медыцынскіх работнікаў, якія інфіцыраваліся з-за таго, што няправільна апранулі ахоўны касцюм ці няправільна прымалі меры перасцярогі, у нашай паліклінікі няма, — падкрэслівае Ірына Болдырава. — Мы правялі навучальны семінар для медыцынскага персаналу па правілах карыстання сродкамі індывідуальнай аховы і іх апрацоўцы, аказанні медыцынскай дапамогі хворым з дыягназам COVID-19, а мае намеснікі, згодна са спецыялізацыяй, прымалі залікі.

Да 80 % выпадкаў — у лёгкай і бессімптомнай форме

Урач агульнай практыкі Святлана ЯНУШКА і **памочнік урача Ангеліна ЦЕХАНОВІЧ**, якія ўваходзяць у склад выязной брыгады, рыхтуюцца да візітаў. За змену яны паспяваюць наведаць 20—27 пацыентаў.

— Візіт пачынаецца з апытання: на што пацыент скардзіцца, потым робім агляд, вымяраем сатурацыю (насычэнне крыві кіслародам) і тэмпературу. Пацыент запаўняе патрабаванне аб самаізаляцыі, атрымлівае лісток непрацаздольнасці, калі трэба, ці даведку, прызначаем лячэнне, калі неабходна, бяром мазкі. Як рэагуюць на дыягназ? Парознаму. Радуе, што большасць ставіцца даволі спакойна. Зрэдку бывае, што людзі не вельмі адэкватна ўспрымаюць інфармацыю пра тое, што яны, напрыклад, два тыдні павінны знаходзіцца ў самаізаляцыі, нават не маючы сімптомаў, але ў цэлым ніякіх праблем не ўзнікае. Некаторым не вельмі камфортна, калі заходзім да іх у абмундзіраванні; хвалююцца, што скажуць суседзі. Але паколькі ездзім мы шмат, нас ужо пазнаюць у гэтым выглядзе, і паніку ні ў каго супрацьчумны касцюм не выклікае, — расказвае Святлана Янушка.

Урач кажа, што да 80 % выпадкаў каранавіруснай інфекцыі працякае ў лёгкай і бессімптомнай форме.

— COVID-19 — зусім не паказанне для шпіталізацыі, для пацыентаў у лёгкай форме ў гэтым няма патрэбы. Спачатку, калі выпадкаў было няшмат, усе шпіталізаваліся. Цяпер з-за запаўняльнасці стацыянараў мы назіраем і пацыентаў з больш яркай клінічнай карцінай. Але важна сачыць за іх станам. Калі ён пагаршаецца, мы выдаём накіраванне, пацыент выклікае хуткую дапамогу, едзе ў стацыянар і па жывой чарзе праходзіць КТ. Яму робяць здымак, вымяраюць сатурацыю: калі яна паніжаецца, яго адразу шпіталізуюць.

Святлана Янушка — адна з тых урачоў, хто праявіў ініцыятыву працаваць у выязной брыгадзе.

— У Святланы Аляксандраўны маленькае дзіця — тры годзікі, але, не шкадуючы асабістага часу, яна працуе з раніцы да вечара. І такіх урачоў у нас нямала. Гэта сведчыць пра тое, што яны правільна абралі сваю прафесію, — рэзюмуе Ірына Болдырава.

Алена КРАВЕЦ.
Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

Мовай лічбаў

У Беларусі на 22 мая зарэгістравана 34 303 выпадкі COVID-19. За суткі колькасць інфіцыраваных вырасла на 932 чалавекі. Папраўліся і выпісаны ці зняты з амбулаторнага назірання 12 833 пацыенты (776 — за апошнія суткі), 190 чалавек за час распаўсюджання інфекцыі выратаваць не ўдалося (пяць памерла за апошнія суткі). У краіне праведзена 419 004 тэсты (за апошнія суткі — 15 768).

Занятасць

ЗНАЙСЦІ РАБОТУ ПРАЗ ІНТЭРНЭТ

У сталіцы наладзілі электронны кірмаш вакансій

Камітэт па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Мінгарвыканкама пры падтрымцы Міністэрства працы і сацыяльнай абароны правёў электронны кірмаш вакансій, на якім было заяўлена 1104 свабодныя рабочыя месцы.

careerfa.ru

Фота носіць ілюстрацыйны характар.

Удзел у згаданым кірмашы з боку наймальнікаў прыняло восем сталічных арганізацый: ААТ «МАЗ» — кіруючая кампанія холдынга «БелаўтаМАЗ», ААТ «Крыніца», ААТ «Мінскі мясакамбінат», восем філіялаў Мінсктранса, УП «Мінскводаканал», УП «Мінскамунцепласетка», РУП «Белмедпрэпараты» і 5-я гарадская клінічная бальніца.

Электронны кірмаш вакансій — вельмі зручная рэч. Яна дае магчымасць не выходзячы з дому азнаёміцца з актуальнымі вакансіямі і нават падабраць сабе прыдатную. Таму што любы чалавек можа адразу ж перадаць сваё рэзюмэ арганізацыі ў анлайн-рэжыме, атрымаць электронную кансультацыю, задаўшы неабходныя пытанні прадстаўніку наймальніка, у прыватнасці аб рэжыме і ўмовах працы, заробку і іншыя. Можна таксама атрымаць запрашэнне на сумоўе ў рэжыме рэальнага часу.

Доступ да згаданых вакансій захоўваецца і пасля заканчэння электроннага кірмашу — яны аўтаматычна былі перанесены ў базу даных на партале службы занятасці www.gsz.gov.by.

Прычым такая электронная паслуга даступная ўсім жыхарам краіны, і яна значна скарачае перыяд пошуку работы — таму падобныя кірмашы вакансій цяпер праходзяць рэгулярна. Тым больш што ў сённяшніх эпідэміялагічных умовах гэтая форма садзейнічання працаўладкаванню адпавядае ўсім патрабаванням бяспекі і, значыць, асабліва запатрабаваная.

Што ж прапаноўвала сталіца патэнцыйным кандыдатам на працаўладкаванне? Самую вялікую зарплату гараджанам прапанаваў Мінскводаканал. На гэтым прадпрыемстве вісіць свабодная вакансія (нават дзве вакансіі, калі дакладней) начальніка станцыі. Прадпрыемства гатова плаціць за гэтую пасаду 1650 рублёў у месяц.

Самая маленькая зарплата — у вакантнай пасады «прыбіральшчык тэрыторый» у тралейбусным парку № 5. Тут гатовы плаціць такому работніку ўсяго 220 рублёў.

Сярод рабочых месцаў з невялікімі заробкамі — да 500 рублёў — можна адзначыць такія вакансіі, як гардэробшчык (490 рублёў) і мыйшчык посуду (500 рублёў) — у аўтобусных парках Мінсктранса, апрацоўшчык тэхналагічных ёмістасцяў і тары (480 рублёў) і лабарант-мікрабіёлаг (таксама 480 рублёў) — у РУП «Белмедпрэпараты», рабочы па комплексным прыбіранні і ўтрыманні домаўладанняў (500 рублёў) — у адным са сталічных ЖЭУ, выхавальнік інтэрната (465 рублёў) — у ААТ «Мінскі мясакамбінат».

Адну з самых шматлікіх груп складаюць вакансіі з заробкам у 500—750 рублёў. Сярод іх можна ўбачыць прапанову папрацаваць кіроўцам трамвая за 635 рублёў у месяц, манцёрам шляху ў філіяле трамвайнага парка — за 750 рублёў. Ёсць вакансія спецыяліста па знешнеэканамічнай дзейнасці на ААТ «МАЗ» — з заробкам таксама ў 750 рублёў, кандуктара ў аўтобусе — 650 рублёў, цесляра на Мінскводаканале — 750 рублёў, інжынера па механізацыі і аўтаматызацыі вытворчых працэсаў у «Белмедпрэпаратах» — з заробкам 642 рублі.

Прыблізна ў тым жа дыяпазоне сталічныя прадпрыемствы гатовы плаціць інжынеру прамысловай бяспекі, слесару па абслугоўванні цеплавых сетак і слесару па рамонце аўтамабіляў, а таксама прадаўцам, кладаўшчыкам, аператарам кацельні.

Нямала прадстаўлена вакансій і з заробкам у дыяпазоне ад 750 і да 1000 рублёў. У іх лік уваходзіць, напрыклад, вакансія маляра на ААТ «МАЗ» (800 рублёў), вытворцы натуральнай каўбаснай абалонкі на ААТ «Мінскі мясакамбінат» (таксама 800 рублёў, чатыры свабодныя месцы).

Кіраўніку студыі (калектыву) аматарскай мастацкай творчасці УП «Мінскводаканал» гатовы плаціць 1000 рублёў. Санітарцы ў 5-й гарадской клінічнай бальніцы абяцаюць заробак у 900 рублёў, прычым, мяркуючы па наяўных даных, бальніцы патрабуецца 130 санітарак.

У межах 750—1000 рублёў прадпрыемствы ў Мінску гатовыя плаціць таксама кухарам, кіроўцам, эканамістам, машыністам аўтамабільнага крана, слесарам, бухгалтарам, электраманцёрам.

Прыкметна менш прадстаўлена вакансій з зарплатай у 1000—1500 рублёў. Так, ААТ «МАЗ» абяцае плаціць 1007 рублёў свідравальшчыку і 1046 рублёў — станочніку шырокага профілю. Мінскі мясакамбінат прапануе 1200 рублёў абвальшчыкам мяса. А 5-я гарадская клінічная бальніца, якую мы ўжо згадвалі крыху раней, абяцае заробак у 1300 рублёў медыцынскім сёстрам, прычым паказвае, што мае патрэбу ў 100 такіх спецыялістах.

Паводле звестак камітэта па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Мінгарвыканкама, у студзені—сакавіку гэтага года колькасць работнікаў, занятых ва ўсіх сферах эканомікі сталіцы, склала 1 млн 80 тыс. чалавек.

І зусім няшмат было прадстаўлена на кірмашы вакансій з зарплатай у 1500—2000 рублёў. Тры такія рабочыя месцы ёсць на «Мінскводаканале» і яшчэ 44 — усё ў той жа 5-й гарадской бальніцы, дзе патрабуюцца дактары, якім абяцаюць 1500 рублёў у месяц. Насамрэч, такія заробкі для сталіцы знаходзяцца зусім не на мяжы магчымасцяў, проста адпаведныя вакансіі звычайна «вісяць» у вузкіх прафесійных колах.

Святлана БУСЬКО.

Галасы прыроды

НА СУВЯЗІ... САЛАВЕЙ

Беларусь стала першай краінай у свеце, дзе ў птушак з'явіліся персанальныя нумары тэлефонаў. Пазваніўшы па іх, можна «пагаманіць» з 10 відамі птушак і паслухаць іх спевы.

Першыя ўласныя нумары з'явіліся ў вялікага голуба, малінаўкі, шчыгла, салаўя, гіля, чорнага дразда, берасцянкі, сіняй сініцы, валавокі і шэрай кугакаўкі. Гэта самыя распаўсюджаныя ў Беларусі і самыя пазнавальныя птушкі, якіх можна пабачыць у парках і нават проста з акна сваёй кватэры. Многія раней чулі гэтыя галасы, але не ўсе ведалі, каму яны належаць.

«У Беларусі налічваецца 332 віды птушак, 70 з іх уключаныя ў нацыянальную Чырвоную кнігу. Птушкам патрэбныя ўвага, дапамога і абарона. Мы ўпэўненыя, што гэты сэрвіс будзе нагадваць пра каштоўнасць дзікай прыроды. Больш за тое, такія званкі будуць цікавыя і на ўроках біялогіі ў школах. Каб паказаць, як спяваюць птушкі, настаўнік зможа проста ім патэлефанаваць», — разважае **Наталля САРАКАВІК, спецыяліст грамадскага аб'яднання «Ахова птушак Бацькаўшчыны» па акцыях і кампаніях.**

Перад тым, як пачуць голас птушкі па тэлефоне, вас павітаюць «птушыныя сакратары». Імі выступілі акцёры Купалаўскага тэатра Раман Падаляка і Крысціна Дробыш.

— Праект «Выйдзі на сувязь з прыродай» працягвае актыўнасці кампаніі А1 у сферы экалогіі. Мы лічым вельмі важнымі экасвядомасць і беражлівае стаўленне да прыроды. А званкі птушкам даносяць гэты меседж да людзей усіх узростаў у цікавай і захапляльнай форме. Таму мы з радасцю адгукнуліся на прапанову АПБ,— падкрэслівае **кіраўнік аддзела карпаратыўных камунікацый А1 Мікалай БРЭДЗЕЛЕЎ.**

Праект «Выйдзі на сувязь з прыродай» з'явіўся дзякуючы ініцыятыве «Крэатон». Яна аб'ядноўвае крэатараў, дызайнераў, менеджараў і стратэгаў, якія дапамагаюць сацыяльным ініцыятывам заявіць пра сябе ў грамадстве. «Ахова птушак Бацькаўшчыны» была кліентам чацвёртага крэатона, на якім каманда **крэатыўнага лідара Алега ДАВЫДЧЫКА** прапанавала навучыць беларусаў адрозніваць птушак па іх галасах. «Мы вельмі доўга перабіралі розныя ідэі камандай з шасці чалавек, — расказаў Алег. — Зачапіліся за тое, што ўсе птушкі гучаць па-рознаму, і пачалі думаць, як у цікавай форме пазнаёміць з гэтым людзей».

Як спяваюць салавей і малінаўка? Каб пачуць адказ, цяпер дастаткова патэлефанаваць па адным з нумароў:

+375445006611 чорны дрозд, +375445006612 усходні салавей, +375445006613 вялікі голуб, +375445006614 гіль, +375445006615 сіняя сініца, +375445006616 чорнагаловы шчыгол, +375445006617 малінаўка, +375445006618 берасцянка, +375445006619 валавока, +375445006620 шэрая кугакаўка.

Надзея НІКАЛАЕВА.

Баланс інтарэсаў

ЗАДАЧА — ЗНІЗІЦЬ ВЫТВОРЧЫ ТРАЎМАТЫЗМ

Хутка ў Законе «Аб ахове працы» з'явяцца некаторыя змяненні. Пра гэта расказаў намеснік міністра працы і сацыяльнай абароны Ігар СТАРАВОЙТАЎ.

— Яны былі падпісаны ў снежні і ўступяць у сілу ў чэрвені бягучага года. Гэта тыя крокі, якія дазволяць аднавіць баланс свабоды бізнесу і дзяржаўнага рэгулявання ў галіне аховы працы. Перш за ўсё на ўзроўні арганізацый закрануты два важныя пытанні. На фоне палітыкі скарачэння праверак неабходна абараняць правы грамадзян. Таму калі фізічная асоба звяртаецца па пэўную інфармацыю ў адпаведны орган, ён абавязаны яе прадставіць. Гэта дазволіць ведамству, не выходзячы на праверку, запатрабаваць дакументы ў арганізацыі, атрымаць іх і вырашыць пытанне грамадзяніна. Таксама ў законе пазначана, што ахова працы ў арганізацыі не толькі знаходзіцца ў падпарадкаванні адпаведнай службы, але таксама з'яўляецца абавязкам кіраўніка арганізацыі і адказных асоб у кожным структурным падраздзяленні.

Рыхтуюцца рэкамендацыі па распрацоўцы сістэм кіравання аховай працы на галіновым і тэрытарыяльным узроўнях. «Мясцовыя органы ўлады, рэспубліканскія органы дзяржаўнага кіравання павінны распрацоўваць і зацвярджаць іх на сваім узроўні. Міністэрства працы і сацыяльнай абароны якраз цяпер працуе над рэкамендацыямі па распрацоўцы такіх сістэм. На працягу гэтага года яны будуць прынятыя. Таксама сумесна з Федэрацыяй прафсаюзаў Беларусі будзем рыхтаваць адзіны парадак для работы тэрытарыяльных мабільных груп, якія ствараюцца на ўзроўні мясцовых органаў улады і таксама займаюцца пытаннямі бяспекі. Гэта будуць рэкамендацыі», — запэўніў Ігар Старавойтаў.

Міністэрства працы і сацыяльнай абароны прапануе пэўныя меры пакарання і заахвочвання работнікаў для павышэння персанальнай адказнасці за выкананне нормаў па ахове працы.

— Нас турбуе тэма адказнасці работнікаў на рабочых месцах, — звярнуў увагу Ігар Старавойтаў. — На гэтае пытанне часта паказваюць і наймальнікі: работнікі забяспечваюцца сродкамі індывідуальнай аховы, на рабочым месцы для іх ствараюцца неабходныя ўмовы, аднак самі людзі ў сілу розных прычын не ўлічваюць рэкамендацыі, агучаныя на інструктажы, не карыстаюцца сродкамі індывідуальнай аховы. Таму і доля выпадкаў вытворчага траўматызму па віне работнікаў высокая: у 2018 годзе яна склала 56 % ад усіх выпадкаў агульнага траўматызму, у 2019-м — 55 %. Аднак важна адзначыць, што неабходна прадугледзець магчымасць прыцягваць да адказнасці за парушэнні ў пытаннях аховы працы не толькі службовых асоб, але і саміх работнікаў. Гэтая тэма абмяркоўваецца ў Міністэрстве працы і сацыяльнай абароны даўно. І цяпер, калі разглядаюцца змяненні ў Закон «Аб адміністрацыйных парушэннях», зноў выходзім з гэтай прапановай. Разам з тым неабходна і заахвочваць тых, хто адказна ставіцца да аховы працы. У Генеральным пагадненні на 2019—2021 гады гэта ўжо замацавана.

Каб зацікавіць наймальніка ў захаванні нормаў па ахове працы ў арганізацыях, прадумваюцца змены і ў сістэме страхавання ад няшчасных выпадкаў на вытворчасці. «Узаемадзейнічаем па гэтым кірунку з Міністэрствам фінансаў і Белдзяржстрахам», — падсумаваў Ігар Старавойтаў.

Дар'я ШЛАПАКОВА.

Суд ды справа

БІЗНЕС-ЛЭДЗІ Ў ГНЯЗДЗЕ ЗЯЗЮЛІ

Чаму мацярынства застаецца за бортам у паспяховых жанчын. Гісторыя гродзенкі праз судовую справу

Суд пазбавіў сям'ю бацькоўскіх правоў. Такія справы разглядаюцца сістэматычна. І ўсё ж гэта гісторыя асаблівая. Бо малое дзіця было адабрана ў маці, якая больш за ўсё дбала пра кар'еру.

m.infox.ru

Фота носіць ілюстратыўны характар.

Яшчэ некалькі гадоў таму маладой прыгожай пары Ігара і Ванды (імёны зменены) маглі многія пазайздросціць. Яны і не хавалі свайго шчасця — здымкі маладых красаваліся ў сацыяльных сетках. Але ў хуткім часе сітуацыя рэзка змянілася. Цяпер толькі і засталося ад некалі шчаслівай маладой сям'і, што гэтыя шлюбныя фота. Ігар і Ванда ўжо другі год жывуць паасобку.

І сітуацыя наўрад ці каго закранула б, каб не трэці член сям'і — малы Міша (імя зменена). Ён нарадзіўся ў пачатку 2017 года, а менш чым праз паўтара года ўжо апынуўся ў Доме дзіцяці. Пры тым, што мае дваіх бацькоў, да таго ж яшчэ і бабуль. Згодна з афіцыйнымі матэрыяламі справы, хлопчык «меў патрэбу ў дзяржаўнай ахове і адабраны ў маці і бацькі ў сувязі з тым, што выхоўваўся ў неспрыяльных умовах, экстрэмальнай жыццёвай сітуацыі, ва ўмовах канфлікту бліжэйшых родных і наяўнасці стрэсавых фактараў».

З матэрыялаў суда становіцца відавочным, што адносіны ў маладой сям'і былі даволі напружаныя. Муж раўнаваў жонку, якая часта выязджала ў камандзіроўкі. Да таго ж выпіваў, яго псіхічны стан таксама выклікаў небяспеку. Як вядома, у такіх сітуацыях заўсёды знойдзецца кропля, якая нарэшце перапоўніць чашу. Такой кропляй стаў зрыў Ігара.

...Пазалетась у маі Ванда паехала ў чарговую камандзіроўку на некалькі дзён. Тут трэба ўдакладніць, што жанчына на той час з'яўлялася дырэктарам прыватнага прадпрыемства. Яна выйшла на работу, калі малому не было яшчэ і паўгода. Для догляду дзіцяці наняла няньку. Алгарытм такі: нянька даглядае малога днём, а ноччу той застаецца з бацькам. Але гэтым разам сітуацыя, што называецца, выйшла з-пад кантролю бізнес-лэдзі. Калі яна патэлефанавала мужу, каб даведацца, як у іх справы, той пачаў гаварыць блытана і нават пагражаў самагубствам. Як потым Ванда раскажа ў судзе, яна палічыла, што муж п'яны, і набрала нумар нянькі, каб тая прыехала і забрала дзіця. У хуткім часе нянька паведаміла, што дзверы ў кватэру ніхто не адчыняе. Тады Ванда папрасіла яе выклікаць міліцыю. Аказалася, што муж у алкагольным стане ледзь не здзейсніў суіцыд і быў змешчаны ў дыспансер, а хлопчыка адправілі ў бальніцу.

Далей сітуацыя развівалася з удзелам савета па прафілактыцы і камісіі па справах непаўналетніх. З бацькамі вялася работа, іх выклікалі, давалі рэкамендацыі. Галоўны пасыл — наладзіць асабістыя адносіны, якія былі даволі нестабільныя. Неаднаразова маладыя бацькі збіраліся развесціся. Да таго ж было заўважана, што муж ужывае курыльныя сумесі і знаходзіцца пад наркалагічным прафілактычным назіраннем.

Маці таксама не знаходзіла часу, каб наведваць свайго сына ў бальніцы. Нагадаю, што малому на той час не было і двух гадоў.

Затое ў суд прынесла вельмі станоўчую характарыстыку. У ёй гаворыцца, што яна, як дырэктар, знаходзіць магчымасць працаваць у складаных эканамічных умовах, захоўвае штат, талерантна адносіцца да супрацоўнікаў, здольна вырашаць праблемы работнікаў. Удасканальвае свае веды, прымае ўдзел у канферэнцыях, семінарах... Як бачым, вытворчыя здольнасці і адказнасць за развіццё кампаніі выйшлі на першы план для маладой маці.

Затое сямейны мікраклімат не паляпшаўся. Сям'я працягвала існаваць у стане хранічнай бязладзіцы. Каб абараніць дзіця, раённая адміністрацыя звяртаецца ў суд аб пазбаўленні іх бацькоўскіх правоў. У іскавай заяве гаворыцца, што маці часта бывае ў раз'ездах і не прымае мер па захаванні сям'і. Падчас усяго суправаджэння, сказана ў дакуменце, бацькі зарэкамендавалі сябе як эмацыянальна няўстойлівыя асобы, не гатовыя да бацькоўскіх абавязкаў. Яны свае асабістыя інтарэсы і амбіцыі ставяць вышэй інтарэсаў сына, а свой удзел у выхаванні бачаць толькі з матэрыяльнага боку.

У тамах судовай справы крок за крокам паўстае развіццё сямейнай драмы. Асабліва прыкра чытаць аб такіх сітуацыях, калі бацькі пакідалі малое дзіця без нагляду, канфліктавалі не толькі паміж сабой, але і з роднымі, перашкаджалі іх зносінам з унукам. Маладая маці вырашыла трымацца далей ад радні, а між тым яе свякроў часта даглядала малога і ў рэшце рэшт стала яго апекуном.

Маці на судзе не пагадзілася з іскавай заявай. Знайшла і аргументы ў сваё апраўданне. Маўляў, у яе ёсць і посуд для дзіцяці, бутэлечка. Падчас знаходжання сына ў бабулі яна наведвала яго, вадзіла ў кафэ, купляла яму сокі, пячэнне. Таксама купіла машынку і камбінезон. Нават зрабіла здымкі, як вядзе сына гуляць.

На судзе Ванда расказала сваю гісторыю. Па яе словах, на момант нараджэння сына ў сям'і было складанае становішча. Мужа, які працаваў грузчыкам, звольнілі за прагулы. Яму дапамагаў бацька: дасылаў грошы з Казахстана, адкуль родам і сам Ігар. Каб палепшыць матэрыяльны стан, яна выйшла на работу. На судзе запэўніла, што пры вяртанні ёй сына будзе працягваць дэкрэтны водпуск. З мужам збіралася разысціся. З яе слоў, ён безадказны і часта скандаліў, любіць выпіць.

Муж, у сваю чаргу, наракаў на жонку за тое, што тая не ўмее весці гаспадарку, не гатуе ежу, не прыбірае, а толькі раз'язжае. Дарэчы, і сам Ігар таксама пісаў заяву, каб яго не пазбаўлялі правоў. Вось толькі суд прызнаў, што маладыя бацькі не прайшлі выпрабавальны перыяд, які ім быў дадзены адміністрацыйнай камісіяй. Асабліва праблемныя адносіны склаліся ў маці з бабуляй хлопчыка. А між тым менавіта свякроў забрала Мішу з дзіцячага дома і аформіла апякунства.

Інтарэсы Мішы ў судзе прадставіў аддзел адукацыі Кастрычніцкага раёна. Было заяўлена, што малога ў асноўным даглядалі бабулі. Пасля таго як хлопчыка экстранна забралі з сям'і, ён перанёс стрэс, перастаў гаварыць. Каб разабрацца ў сітуацыі, малога пасля бальніцы перадалі пад апеку бабулі, а з бацькамі быў падпісаны план па абароне правоў дзіцяці. У раённым аддзеле адукацыі зрабілі вывад, што план не выкананы. Адным з негатыўных фактараў з'яўляецца раз'язны характар работы маці.

Суддзя Ксенія Стасюкевіч, якая вяла гэту справу, адзначае, што апошнім часам назіраецца тэндэнцыя, калі бацькоўскіх правоў пазбаўляюць не якіх-небудзь бацькоў-п'яніц, а звычайных, здаецца, сужэнцаў. Многія не разумеюць: як так? І праўда, што тут асаблівага? Маці ідзе па кар'ернай лесвіцы — дык гэта патрабаванне часу, жанчына хоча і можа быць паспяховай.

— На жаль, сёння бацькі часам больш дбаюць пра кар'ерны рост і забываюць аб непаўналетніх дзецях. Маўляў, што такога — на бабулю пакінулі. Звычайная справа, так жыве нямала маладых сем'яў, — расказвае Ксенія Сцяпанаўна. — Калі паўстае пытанне аб пазбаўленні бацькоўскіх правоў, яны ў роспачы. Трэба, каб моладзь разумела свае абавязкі, і не толькі матэрыяльныя.

Ці варта выхоўваць такіх бацькоў прававымі метадамі? На думку суддзі, прыспела пара прымаць суду прамежкавае рашэнне.

— Лічу, што трэба ўносіць змены і ў заканадаўства. У прыватнасці, дазваляць суду ў выключных выпадках прымаць рашэнне аб ізаляцыі дзяцей, забіраць іх з сям'і, даваць магчымасць бацькам усвядоміць, што адбылося, і толькі пасля гэтага вырашаць пытанне аб пазбаўленні бацькоўскіх правоў.

На сённяшні дзень суд — гэта канчатковая інстанцыя. Праўда, да гэтага сям'я, як правіла, знаходзіцца ў статусе сацыяльна небяспечнай. Калі праз паўгода гэты стан не выправіцца, справа накіроўваецца ў суд для канчатковага рашэння.

Калі адбіраюць дзяцей у тых маці, якія злоўжываюць спіртным, губляюць сваю волю і ставяць пад бяспеку жыццё дзяцей, гэта зразумела. Але чаму такое адбываецца ў вонкава прыстойнай сям'і, з дастаткам, дзе ў маці няма шкодных звычак? Падумаеш, ездзіла ў камандзіроўкі, імкнулася стаць паспяховай... Такіх сем'яў нямала. Але выпадак у сям'і Ванды паказаў: маці, якая робіць стаўку толькі на бізнес, рызыкуе самым дарагім, што даецца жанчыне, — сваім дзіцем.

Маргарыта УШКЕВІЧ.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ТОРГОВ

Организатор торгов	**ООО «ЛКВР» (УНП 692074939) г. Минск, ул. П. Бровки, д. 3, корп. 2, пом. 429, тел. 8 029 960 44 34, e-mail info@lkvr.by**
Продавец	**Индивидуальный предприниматель Коптик Александр Александрович (УНП 690861383) в лице антикризисного управляющего ЧПУП «Аналитик-центр», тел.: 8 017 284 05 66, 8 017 284 05 67**
Форма, дата, время и место и проведения торгов	**Открытые торги (аукцион) 24.06.2020 в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. П. Бровки, 3/2, пом. 429**
Сведения о предмете торгов и порядок ознакомления с ним	№ лота: 1 — Наименование объекта: **прицеп (специальный сортиментовоз МАЗ 8378, кузов Y3M83781030013393, 2011 года выпуска, бывшее в употреблении)** — Начальная цена предмета торгов (без учета НДС), бел. руб.: 7 920,00
Место нахождения предмета торгов	г. Вилейка
Порядок проведения торгов	Шаг торгов – 5 % от начальной цены предмета торгов. Победителем торгов признается участник, предложивший наиболее высокую цену. Участнику, не выигравшему торги, задаток возвращается в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов. В случае, если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником, предмет торгов продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5%. Результаты торгов оглашаются публично в день проведения торгов. Организатор торгов вправе отказаться от их проведения, не позднее чем за один день до даты проведения. Победитель аукциона (единственный участник аукциона) в течение 5 банковских дней со дня проведения аукциона оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов в размере 5 % от окончательной цены продажи предмета аукциона и возмещает затраты на организацию и проведение результативного аукциона. Подробнее по телефону: 8 029 960 44 34
Сроки и порядок приема заявок и зачисления задатка	**Для участия в торгах в срок по 23.06.2020 до 18.00 необходимо:** 1) перечислить задаток в размере 10 % от начальной цены предмета торгов на р/с BY09UNBS30122009110000000933 в ЗАО «БСБ Банк», код UNBSBY2X, УНП 692074939, получатель ООО «ЛКВР», назначение платежа: задаток 10% по лоту № 1 индивидуального предпринимателя Коптика Александра Александровича, аукцион 24.06.2020; 2) подать заявление на участие и необходимые документы по адресу: г. Минск, 220041, а/я 10 либо на эл. почту **lkvr.torgi@tut.by. Тел.: (8029) 960-44-34**
Порядок заключения договора и уплаты цены предмета торгов победителем торгов	Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 рабочих дней после проведения аукциона. Оплата объекта производится в течение 15 календарных дней со дня проведения аукциона, если иной срок не будет установлен собранием (комитетом) кредиторов

О ПРОВЕДЕНИИ ТОРГОВ по продаже имущества должника – ООО «КарБилд» (продавец)

Предмет торгов:
Лот № 1: автомобиль грузопассажирский вагон UAZ 3909; 2004 г. в., начальная цена – 1500,00 рублей.
Лот № 2: автомобиль грузовой специальный платформа KAMAZ 5320, 1990 г. в.; начальная цена – 8000,00 рублей.

Организатор торгов: **управляющий Волкова Л.Е., тел. 8 (029) 654-98-95.**
Местонахождение лотов и место проведения аукциона: **г. Гродно, ул. Дзержинского, д. 21.**
Дата, время и место проведения аукциона: **7 июля 2020 года в 12.00.**
Ознакомление с предметом торгов осуществляется в рабочие дни с 10.00 до 16.00.

Задаток (10 % от начальной цены лота) перечисляется на р/с BY58OLMP30126000233810000933 в ОАО «Белгазпромбанк», г. Минск, БИК OLMPBY2X, получатель ООО «КарБилд» (УНП 590978521).
Шаг аукциона – 5 % начальной цены лота.
Заявки на участие в торгах принимаются организатором **до 6 июля 2020 г.** по электронному адресу: larasbc@inbox.ru, оригиналы по адресу: а/я 26, 231592, г. Мосты, Гродненская обл.
Порядок оформления участия в торгах, критерии выявления победителя торгов и порядок оформления результатов торгов определяется ст.ст. 127, 128, 129 Закона Республики Беларусь от 13.07.2012 № 415-З «Об экономической несостоятельности (банкротстве)».
Срок подписания договора купли-продажи – 15 рабочих дней после проведения аукциона.

УНН 190431606
УП «Белконфискат»
объявляет о проведении электронных торгов 16.06.2020 г. по продаже легкового джипа Секун П.В.:
«БМВ Х6», 2011 г. в.,
начальной стоимостью 29 300 рублей.
На сайте belkonfiskat.by размещена информация о порядке торгов. Справки по тел.: 8 (017) 3639489, 8 (029) 7790809.

УНН 190431606
УП «Белконфискат»
объявляет о проведении электронных торгов 12.06.2020 г. по продаже легкового авто Дрозд С.И.:
«Ауди А4», 2005 г. в.,
начальной стоимостью 5 100 рублей.
На сайте belkonfiskat.by размещена информация о порядке торгов. Справки по тел.: 8 (017) 3639489, 8 (029) 7790809.

УНН 190431606
УП «Белконфискат»
объявляет о проведении электронных торгов 09.06.2020 г. по продаже легкового джипа Самохвастовского А.И.:
«Лэнд-Ровер Рендж-Ровер Спорт», 2007 г. в.,
начальной стоимостью 11600 рублей.
На сайте belkonfiskat.by размещена информация о порядке торгов. Справки по тел.: 8 (017) 3639489, 8 (029) 7790809.

ОАО «Климовичский ликеро-водочный завод»
сообщает, что 23.06.2020 года
СОСТОЯТСЯ ЭЛЕКТРОННЫЕ ТОРГИ ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА (зданий, сооружений и оборудования), расположенного по адресу:
Могилевская область, Быховский район, аг. Грудиновка;
Могилевская область, г. Климовичи, ул. Волкова, 10;
Могилевская область, Хотимский район, аг. Забелышин;
Могилевская область, Костюковичский район, д. Пасека;
Могилевская область, Кричевский район, аг. Красная буда.
Информацию об условиях проведения электронных торгов можно уточнить на сайтах **torgi.gov.by и bankrot.gov.by.**
УНП 700103211

Аздараўленне

«Зорка» каля возера Юбілейнае

Найстарэйшы летнік Гродзеншчыны пачне аздараўленчую кампанію цалкам абноўленым

Летнік «Зорка Юбілейная» — адзін з самых папулярных у гродзенскіх школьнікаў. І таму нямала прычын. Адна з іх — гэта тое, што месціцца ён у зялёнай зоне на беразе возера Юбілейнае. З абласным цэнтрам аздараўленчы аб'ект звязваюць маршруты гарадскога транспарту. А сёлета летнік пашырыў свае магутнасці: тут уведзена два новыя спальныя корпусы.

Зараз на тэрыторыі летніка вядуцца апошнія прыгатаванні да прыёму наведвальнікаў. Меркавалася, што першая змена пачнецца 15 чэрвеня, але на днях стала вядома, што пачатак аздараўленчага сезона перанесены на 1 ліпеня. Адпаведна зменшыцца і колькасць змен — плануецца, што іх будзе дзве па 18 дзён кожная. Між тым заяўкі паступаюць увесь час.

З **дырэктарам дзіцячага аздараўленчага летніка «Зорка Юбілейная» Ларысай ЯНЧУК** абыходзім тэрыторыю. Кіраўніца звяртае ўвагу на кожную дэталь, кожны аб'ект інфраструктуры. І нездарма. За апошнія некалькі гадоў летнік цалкам абнавіўся. У яго мадэрнізацыю ўкладзена нямала сродкаў. Значную дапамогу аказваюць шэфы, а гэта 13 арганізацый, у асноўным структурных падраздзяленняў ЖКГ. З іх дапамогай старыя будынкі набылі сучасны выгляд, заменены вокны і дзверы, адноўлены дах, падлога, з'явіліся новыя мэбля і абсталяванне.

— Калі дзеці бачаць, што вакол прыгожа і акуратна, яны самі падтрымліваюць парадак, акты вандалізму даўно ў мінулым, — заўважае Ларыса Міхайлаўна.

Сучасны выгляд цяжка суаднесці з узростам летніка, а ён даволі сталы. Летась тут адзначылі юбілей — 65 гадоў стварэння. Аб значных падзеях нагадвае альтанка з рэтраспектывай гісторыі ўстановы, дзе сабраны фотаздымкі розных часоў — ад 1950-х гадоў да сучаснасці.

Цяпер галоўны клопат дырэктара — добраўпарадкаванне спальных карпусоў. Для гэтай работы набіраецца сезонны персанал. Падчас наведвання жанчыны якраз заносілі матрацы, засцілалі бялізну. Большая частка памяшканняў цалкам падрыхтавана для заезду, у іншых работы засталося на некалькі дзён.

Падыходзім да двух новых карпусоў. Яны ўведзены ў эксплуатацыю зусім нядаўна, і кожны разліцаны на 30 месцаў. Такім чынам сёлета «Зорка Юбілейная» зможа прыняць 320 чалавек замест 260, як было раней. Прадугледжана і безбар'ернае асяроддзе.

Важны плюс летніка — зялёная зона. На тэрыторыі расце шмат магутных соснаў, а менавіта за агароджай пачынаецца спуск да возера Юбілейнае. Водны рэсурс таксама задзейнічаны ў адпачынку, ёсць свая пляжная зона, дзе можна плаваць і загараць, таксама скарыстацца катамаранам. Для аматараў спорту ўстаноўлены дзве новыя варкаўт-пляцоўкі, есць валейбольная і баскетбольная пляцоўка з зонай для гледачоў. Для малодшых школьнікаў усталяваны забаўляльныя атракцыёны. Дарэчы, новыя карпусы — таксама для іх.

Сёлета пашырана і медыцынская сетка, замест аднаго аб'екта будзе працаваць два. У адным дамку — прыём урача і працэдурны кабінет, а другі пераабсталявалі ў медыцынскі ізалятар на два пакоі. Зменіцца і фармат правядзення розных мерапрыемстваў, сёлета яны будуць праводзіцца на свежым паветры і па асобных атрадах, каб не дапусціць вялікага натоўпу ў адным месцы.

Як расказалі ў Гродзенскім абласным упраўленні рэспубліканскага цэнтра па аздараўленні і санаторна-курортным лячэнні насельніцтва, стацыянарныя летнікі ў рэгіёне пачнуць працаваць з 1 ліпеня, а прышкольныя — з 15 чэрвеня. Галоўны прынцып камплектацыі — заяўляльны. Гэта значыць, што і бацькі, і сам школьнік выказваюць жаданне наведваць дзіцячую аздараўленчую ўстанову. Арганізатары павінны забяспечыць максімальную бяспеку дзяцей.

Усяго ў вобласці будзе працаваць 24 загарадныя летнікі.

Сярэдні кошт пуцёўкі ў круглasутачным лагеры прыблізна складзе 420—450 рублёў, з іх 205 рублёў — датацыя дзяржавы. У спартыўна-аздараўленчым памер датацыі — 227 рублёў, у прышкольным дзённым — 85 рублёў.

Што датычыцца падрыхтоўкі летнікаў, гэта работа завяршаецца, усе сродкі рэспубліканскага і абласнога бюджэту, а таксама сродкі, зароблены на суботніку, амаль цалкам засвоены, апошні штрых — акты гатоўнасці, якія ўстановы павінны атрымаць у найбліжэйшы час.

Маргарыта УШКЕВІЧ, фота аўтара.

Год Уладзіміра Караткевіча

Успамінае Вячаслаў Рагойша...

Сярод навінак, якія рыхтуюцца да выдання ў айчынных выдавецтвах і звязаны з 90-годдзем з дня нараджэння класіка беларускай літаратуры Уладзіміра Сямёнавіча Караткевіча, — кнігі і «Мастацкай літаратуры», і «Беларускай Энцыклапедыі імя Петруся Броўкі», і іншых выдавецтваў краіны.

У энцыклапедычным выдавецтве праз некаторы час пабачыць свет аднатомная персанальная энцыклапедыя «Уладзімір Караткевіч», якая пад адной вокладкай прадставіць чытачу больш за 1000 артыкулаў пра розныя творы пісьменніка, адрасы, дзе ён жыў і працаваў, пра сяброў Уладзіміра Караткевіча, яго крытыкаў, пра перакладчыкаў паэзіі і прозы нашага класіка на розныя мовы народаў свету.

«Мастацкая літаратура» працуе над падрыхтоўкай да выдання публіцыстычнай, гісторыка-літаратурнай кнігі эсэ доктара філалагічных навук, прафесара Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта Вячаслава Пятровіча Рагойшы «Дзесяць сагаў». Рэльефным героем кожнага эсэ паўстае класік беларускай літаратуры, аўтар легендарнага рамана «Каласы пад сярпом тваім». Вячаслаў Рагойша быў блізка знаёмы з Караткевічам, яго асяроддзем, таму і ўспаміны падаюцца жывымі, пераканаўча праўдзівымі, напоўненымі святлом, дабрынёй, піетэтам у адносінах да У. С. Караткевіча. «Дзесяць сагаў» — яшчэ адна трывалая цаглінка ў падмурак дома памяці «Уладзімір Караткевіч».

Сяргей ШЫЧКО.

Чувашскі паэт пра класіка

Класіку беларускай літаратуры Уладзіміру Караткевічу прысвечаны многія паэтычныя творы. У свой час была выдадзена кніга «Уладзімір Караткевіч: вядомы і невядомы». І адзін з яе раздзелаў выдаўцы склалі з вершаў-прысвячэнняў. Пры ўмове, што там былі сабраны далёка не ўсе творы, прысвячэнняў аказалася недзе каля 60 (!). У Леаніда Дранько-Майсюка нават дзве «караткевічаўскія» паэмы. Апошнім часам з'явіліся вершы-прысвячэнні Уладзіміру Карткевічу і ў іншых нацыянальных паэзіях: рускай (Юрый Шчарбакоў), чувашскай (Валерый Тургай), украінскай (Глеб Кудрашоў), чачэнскай (Адам Ахматукаеў), сербскай (Даяна Лазаравіч)... Толькі што Мікола Мятліцкі пераклаў яшчэ адзін чувашскі верш, прысвечаны беларускаму мастаку слова, — «Памяці У. С. Караткевіча» . Аўтар — народны паэт Чувашыі Юрый Семяндэр. Паэт з Чэбаксар бываў у Беларусі, добра ведае беларускую літаратуру ранейшых дзесяцігоддзяў. Перакладаў беларускую паэзію на чувашскую мову. А зараз вось прычыніўся да нашай беларускай старонкі і такім чынам...

Кастусь ЛАДУЦЬКА.

Юрый СЕМЯНДЭР, народны паэт Чувашыі

Памяці У. С. Караткевіча

Ў беларускай паэзіі
Многа слаўных сыноў:
І Купала, і Колас,
І Танк, і Гілевіч...
Вельмі кметна паміж
Самых зыркіх сцягоў
Развінуўся душой
Караткевіч.
Па-чувашску чытаем
Шамякіна мы,
Сталі блізкімі Мележ,
Алесь Адамовіч...
Ды як зорка між іх,
Як агонь-дынаміт —
Узрыўны і гарачы заўжды
Караткевіч.
Макаёнак Андрэй
Ў Чэбаксарах як свой,
Любы Дудараў нам,
Не чужы — Рамановіч...
Верым мы: будзе з намі
Твой кожны герой,
Майстар сонечных п'ес
Цімер[1] наш Караткевіч.

Пераклад з чувашскай Міколы МЯТЛІЦКАГА.

1 Цімер (чув.) — Уладзімір.

• У тэму

Адукацыйны партал — у дапамогу

Як гродзенскія педагогі распаўсюдзілі свой вопыт у віртуальнай прасторы

З-за складанай эпідэміялагічнай сітуацыі ўзнікла патрэба ў новай форме навучання. Так быў створаны гарадскі адукацыйны партал, дзе педагогі дзяліліся сваімі напрацоўкамі і тлумачылі новыя тэмы па многіх прадметах. У праекце ўдзельнічалі найлепшыя педагогі горада, якія рыхтавалі пераможцаў прадметных алімпіяд і самі станавіліся лаўрэатамі розных конкурсаў.

Для многіх школьнікаў такая падтрымка аказалася вельмі сваечасовай, бо памагла пазбегнуць «прабелаў» у вывучэнні тых ці іншых прадметаў і атрымаць высокі бал пры атэстацыі за апошнюю чвэрць. На партале размешчаны матэрыялы заняткаў па хіміі, біялогіі, фізіцы, гісторыі Беларусі і сусветнай гісторыі, беларускай і рускай мовах, інфарматыцы. Гэтыя ўрокі, лічаць арганізатары, дапамогуць замацаваць веды, якія спатрэбяцца і на цэнтралізаваным тэсціраванні.

— У гэтым напрамку мы пайшлі па просьбе бацькоў. Напачатку партал планаваўся як платформа для таго, каб прапанаваць нешта цікавае школьнікам, але потым арганізавалі і такія відэаўрокі, — паведаміла **намеснік начальніка аддзела адукацыі Гродзенскага гарвыканкама Алена ПАХОМАВА.**

Віртуальныя заняткі прыйшліся даспадобы не толькі школьнікам. Работай сваіх калег зацікавіліся і педагогі. Для маладых настаўнікаў гэта яшчэ і магчымасць павысіць сваё майстэрства, пераняць вопыт.

Настаўнік распрацоўвае ўрок, тую частку, якая датычыць новай тэмы, гэта 7—15 хвілін. Аператар здымае гэту частку на відэа, пасля ролік манціруецца і выкладваецца як на сам партал, так і на тэматычны YouTube-канал. Пры гэтым увесь працэс, ад распрацоўкі ўрока да апублікавання гатовага матэрыялу, суправаджаецца кансультацыйнай падтрымкай метадычнага работніка, — растлумачыла Алена Пахомава.

Настаўнікі імкнуцца, каб гэта было і даступна, і цікава. Відавочна, што новы партал атрымаў папулярнасць у гродзенцаў. А на YouTube-канале папулярным стаў урок беларускай мовы. Да прагляду далучылася і замежная аўдыторыя.

— Настаўнікі з захапленнем уключыліся ў гэты працэс, — кажа суразмоўніца. — Для іх гэта новая практыка, яны людзі творчыя, могуць удасканальваць сваё майстэрства.

Партал дае магчымасці размяшчаць інфармацыю ўсёй педагагагічнай суполкі горада, знаёміць з новым напрацоўкамі. Інтэрнэт-рэсурс даступны для шырокага кола наведвальнікаў. Адсюль, са спецыяльнай укладкі «Культурны вольны час анлайн» нават можна адправіцца ў захапляльнае падарожжа па культурных і гістарычных аб'ектах краіны. А яшчэ, што вельмі важна і цікава, паўдзельнічаць у майстар-класах, якія падрыхтаваны педагогамі дадатковай адукацыі горада. Напрыклад, цэнтр творчасці дзяцей і моладзі «Спектр» прапануе заняткі па вырабе сувеніраў у тэхніцы арыгамі. Ёсць фізкультурныя заняткі, таксама магчыма усёй сям'ёй прыняць удзел у інтэлектуальных гульнях.

Платформа пастаянна папаўняецца новымі рэсурсамі. Напрыклад, зараз з'явілася новая ўкладка «Віртуальны школьны музей», якая дазваляе здзейсніць вандроўку па ўсіх школьных музеях горада. Такі віртуальны тур — ноу-хау гродзенскіх распрацоўшчыкаў.

Маргарыта УШКЕВІЧ.

Беларускі кнігазбор

Лісты драматычнай памяці

«Беларуская навука» зрабіла цудоўны падарунак чытачам да 75-годдзя Вялікай Перамогі, выдаўшы ў серыі «Беларускі кнігазбор» «Выбраныя творы» народнага паэта Беларусі Аркадзя Куляшова.

Найлепшыя вершы класіка беларускай паэзіі, сярод якіх і славутая «Балада аб чатырох заложніках», дапаўняюць паэмы: «Крыўда», «Сцяг брыгады», «Прыгоды цымбал», «Дом № 24», «Зорка Канікула (Толькі ўперад)», «Цунамі», «Далёка да акіяна», «Варшаўскі шлях», «Хамуціус». Такія радкі не забываюцца: «Са слупоў, са сцен, аканіцаў / Пагражаюць Мінаю загадам: / Ён павінен скарыцца, / З'явіцца, / Здацца ў рукі фашысцкім уладам. / І вісіць той загад друкаваны / На Мінаевай хаце і клеці; / А не з'явіцца — расстраляны / Будуць заўтра заложнікі — / Дзеці...»

Увайшлі ў кнігу і пераклады Аркадзя Куляшова — вершы А. Пушкіна, М. Лермантава, С. Ясеніна, украінскіх мастакоў слова А. Малышкі і Л. Першамайскага, а таксама верш балкарца К. Куліева. Завяршаюць кнігу артыкулы пісьменніка пра сваю творчасць, гутарка з ім Уладзіміра Анісковіча, ды падрыхтаваная Марыяй Твардоўскай перапіска Аркадзя Куляшова і Аляксандра Твардоўскага.

«Беларускі кнігазбор» чарговы раз уразіў грунтоўнасцю выдання. Фактычна ў аднатомніку ўдалося сабраць усё самае значнае, што выйшла з-пад пяра народнага паэта Беларусі. Дарэчы, на пачатку «Выбраных твораў» чытача чакае сустрэча з грунтоўным, манаграфічнага характару артыкулам Таісы Грамадчанкі «Усё аддаў праўдзівому радку...»

Больш за сорак гадоў прайшло з часу, як перастала біцца сэрца вялікага паэта Аркадзя Куляшова (1914—1978), а вершы яго жывуць і цяпер у свядомасці чытачоў, з'яўляюцца для новых пакаленняў беларусаў мастацкімі дакументамі няпростага часу. Найперш — мастацкімі дакументамі і сведчаннямі пра драматычныя падзеі Вялікай Айчыннай вайны.

Сяргей ШЫЧКО.

Наш культурны асяродак
Жыранделя
Выпуск № 17 (505)

Марыя КАСЦЮКОВІЧ:

«Спачатку дзіцячае кіно было вялікім выхавальнікам, а потым стала часткай дзяцінства»

У сферы нашай культуралагічнай літаратуры чакаецца прыбаўленне: праз пэўны час пад цвёрдай вокладкай мы зможам знайсці грунтоўнае і займальнае даследаванне беларускага дзіцячага кіно — таго, што ў савецкія і постсавецкія часы адмыслова ствараласа для вельмі асаблівай аўдыторыі. Кніга «Дзіцячы сеанс», багатая на знойдзеныя ў архівах матэрыял і ілюстрацыі, ставіць задачай адказаць на пытанне, якога гледача выхавалі беларускія дзіцячыя карціны. Гэтую і іншыя інтрыгі раскрывае даследчыца з Нацыянальнай акадэміі навук, а таксама каардынатарка конкурсу нацыянальных кінашкол кінафестывалю «Лістапад» Марыя Касцюковіч. Для выхаду «Дзіцячага сеанса» справа засталася за малым: у жніўні на платформе ulej.by распачнецца краўдфандынгавая кампанія па зборы сродкаў на выданне кнігі, і яна абавязкова павінна быць паспяховай. Мы тым часам сустрэліся з Марыяй, каб захапіцца прапанаванай тэмай.

— Ці з'яўляецца дзіцячы сеанс — што да назвы тваёй кнігі — асобнай з'явай?

— Ён быў устойлівай традыцыяй, пакуль існавала савецкая сістэма, а разам з ёй — цэлая інфраструктура для дзяцей з дзіцячымі кавярнямі, часопісамі, радыё, гуртамі, спартшколамі і іншым. Існавалі нават дзіцячыя кінатэатры. Сеансы для дзяцей ішлі раніцай альбо днём і каштавалі танней, а часам нават суправаджаліся пазнавальнымі лекцыямі альбо каментарыямі да фільмаў.

— Што дазваляе табе выдзеліць дзіцячае кіно ў беларускім кінематографе як пэўны феномен?

— У нас былі фільмы, якія пракатваліся па ўсім Савецкім Саюзе, падабаліся дзецям і шмат для каго станавіліся часткай дзяцінства. Мая знаёмая жартуе, што «Прыгодамі Бураціна» ёй сапсавалі дзяцінства, хоць іншыя, вядома, разам са стужкай «Пра Чырвоную Шапачку» слушна называюць гэты фільм найлепшым у Леаніда Нячаева. І ў нас былі аўтары, якія ўмелі здымаць для дзяцей, а гэта рэдкае майстэрства — сёння мы можам бачыць, што яно некуды знікла. Праўда, многія не ведаюць, што гэта спадчына — наша. Часам мы думаем пра сябе, як пра абломак імперыі, і не гатовы ўспрымаць наша нашым, быццам яно зроблена недзе там — гэта вялікая постканаліяльная праблема. Падчас працы над кнігай мне даводзілася тлумачыць «прысваенне» савецкіх набыткаў і чуць прэтэнзіі, што я пішу пра беларускі кінематограф так, быццам аддзяляю яго ад савецкага. У адным расійскім выдавецтве я атрымала вялізную водпаведзь аб тым, што ніякага беларускага ці ўкраінскага кіно не было — было толькі савецкае. Пры гэтым яно выдавала кнігі, скажам, пра гісторыю расійскага кінематографа 1930—1950-х. Тым не менш беларускае кіно, дзіцячае таксама, існуе і не мае патрэбы ў тым, каб яго абгрунтоўваць і абараняць.

— У савецкія часы кіно фарміравалася інтарэсамі ідэалогіі: для чаго ўладзе было патрэбна дзіцячае кіно?

— Каб выхоўваць дзяцей. Лічыцца нават, што дзіцячае кіно прыдумалі бальшавікі, бо ніхто больш не меў у ім патрэбы. Савецкая сістэма была апантаная ідэяй выхавання новага чалавека і па ленінскім запавеце лічыла, што самым эфектыўным інструментам для гэтага з'яўляецца кінематограф. Усё, на чым трымалася дзіцячае кіно ў Савецкім Саюзе, было створана ў 1920-я тымі, хто сапраўды марыў пабудаваць утопію. А для ўтопіі трэба было выхоўваць дзяцей у камуністычным духу. Спачатку дзіцячае кіно сапраўды было вялікім выхавальнікам, а потым стала проста часткай дзяцінства.

— То-бок дзіцячае кіно было разлічаным на будучыню праектам па выхаванні верных камуністаў...

— Так, але ідэалогія тут спалучалася са шчырым імкненнем палепшыць рэчаіснасць. Пішучы кнігу, я нават усвядоміла, што шасцідзясятнікі, пра якіх кажуць як пра пакаленне, што зрабіла найвялікшы ўнёсак у савецкую культуру, — гэта дзеці дзяцей тых, каго настройвалі на лепшае заўтра, хто верыў, што працуе як ламавік і памірае дзеля таго, каб дзеці жылі інакш. То-бок шасцідзясятнікі — гэта праект тых, хто доўгія гады жыў утопіяй.

— Сёння дзіцячага кіно як такога не існуе — ёсць сямейнае, настолькі ж дзіцячае, наколькі дарослае. Што ў савецкім кантэксце трэба разумець пад дзіцячым кіно?

— Гэта нейкае выказванне пра свет для чалавека, які пра яго пакуль нічога не ведае. Савецкае дзіцячае кіно было аўтаномнай замкнутай сферай, што часта пазбягала тэм, на якія з дзецьмі важна гаварыць, паколькі намагалася захаваць ідэалістычны вобраз дзяцінства, дзе ўсё добра. Хіба толькі школьныя драмы падымалі пытанні, як жыць у грамадстве, быць адзін з адным і адстойваць сябе ва ўмовах ханжаскай маралі. Мне падаецца, тое, што савецкае дзіцячае кіно аддзяляла дзяцей ад дарослых, было яго вялікім пралікам. Дзеці як бы жылі ў сваім свеце і глядзелі свае фільмы, таму ў іх была вялікая спакуса прычыніцца да іншага кіно — для цэлых пакаленняў рэчаіснасць была сумнай і нарматыўнай, і ім абавязкова трэба было пралезці ў таемнае і сакрэтнае. Калі ў 1980-х з'явіліся «відзікі» і ўсе пабеглі глядзець «Рабакопа», новыя карціны сталі глытком паветра, а старыя забыліся. Нягледзячы на гэта, мы і сёння замест развіцця іншых фарматаў спрабуем захаваць тое самае дзіцячае кіно, быццам імкнёмся адчуць, што дзяцінства — непахіснае.

— Ты сказала, што пэўных тэм пазбягалі. Што хавалася ад дзяцей?

— У фільмах рэдка казалі ўласна аб праблемах, з якімі дзіця сутыкаецца альбо можа сутыкнуцца, напрыклад, у стасунках з бацькамі. Савецкае дзіцячае кіно, як правіла, перадавала вельмі сацрэалістычны погляд на свет — такую ўтопію і ідылію. Не скажаш, што гэта страшна, бо ўсё ж у чалавека павінны захоўвацца вобразы, якія будуць служыць падтрымкай, таму многія і настальгуюць па фільмах накшталт «Па сакрэце ўсяму свету» — для іх гэта адбітак дзяцінства. Але па вялікім рахунку прызначэнне дзіцячага фільма — дапамагчы дзіцяці перажыць складаныя пачуцці, гэта такая, груба кажучы, псіхатэрапія, што важна настолькі ж, наколькі даць гледачу мадэль паводзін і растлумачыць, як пабудаваны свет. Тым часам у кіно не ўпісваліся амаль усе экстрэмальныя сітуацыі — сваркі з бацькамі, складаныя бацькі, развод бацькоў, дзеці з абмежаванымі магчымасцямі, хвароба альбо смерць блізкіх і смерць як такая. Пачуцці з негатыўнай афарбоўкай калі не пазбягаліся, то нявінна абыгрываліся, напрыклад, праз так званы эліпсіс — нехта памірае, зацямненне і ўсё. За адмоўныя эмоцыі нават больш адказвала анімацыя. Быў, напрыклад, мультцік «Рукавіца» Рамана Качанава, у якім дзяўчынка марыла аб сабаку і марыла так моцна, што замест сабачкі даглядала рукавіцу: яна бегала з гэтай рукавіцай, і тая ператварылася ў сабачку, але ў выніку распусцілася, што выклікала слёзы і соплі.

— Якія каштоўнасці савецкае дзіцячае кіно намагалася перадаць дзецям і як яны мяняліся з цягам часу?

— У 1920-я мы расцілі чалавека будучыні, які ўсё можа сам і не мае патрэбы ў аўтарытэтах — у фільмах дзеці бунтавалі супраць бацькоў і нават перавыхоўвалі іх. Напрыклад, у карціне «Крываножка» бачна, што дзеці ўсёмагутныя і здольны змяніць свет. А ў 1930-х іх тэрмінова сталі вучыць быць маленькімі і паслухмянымі, наследаваць бацькам, пераймаць эстафету і ахвяраваць сабой дзеля нечага вялікага. Калі героі 1920-х, як правіла, былі сіротамі і ў адзіночку здзяйснялі подзвігі, то ў 1930-х галоўнай каштоўнасцю стаў калектывізм. Так працягвалася недзе да канца 1950-х, а ў 1960-х сталі змагацца за тое, каб чалавек быў чалавекам: не толькі здзяйсняў подзвігі, але і адчуваў, мысліў, самастойна вызначаў сваё жыццё. Герою стала дазволена не глядзець на калектыў і нават уступаць з ім у канфлікт — гэты пераварот пачаўся ў школьным фільме.

— Школьны фільм — гэта асобны жанр?

— Так, дзеянне адбываецца ў школе, як, напрыклад, у карцінах «Дажывём да панядзелка» з Вячаславам Ціханавым альбо «Расклад на паслязаўтра». Замест асобы і калектыву ў школьным фільме выдзелілася трыяда — вучань, настаўнік і бацькі. У гэтым трохкутніку і нараджаецца канфлікт: звычайна гэта размова пра тое, як бацькі і ўвогуле дарослыя ціснуць на дзяцей. Дарэчы, дагэтуль дзіцячае кіно было менавіта дзіцячым — яно разлічвалася на дашкольнікаў і малодшых школьнікаў, а пасля, маўляў, ідзі глядзі «Паданне пра зямлю Сібірскую». Але ў канцы 1950-х — пачатку 1960-х з'явілася юнацкае кіно, якое стала гаварыць таксама з тымі, каму 14 ці 15 гадоў, напрыклад, пра школьнае каханне, як у слязлівай драме «А калі гэта каханне» Юлія Райзмана. Адным словам, бязлікая дзіцячая аўдыторыя стала сегментавацца, і для кожнага савецкі кінематограф прапанаваў сваё.

— А што змянілася ў 1970-х?

— У 1970-х сталі гаварыць, што дзіця мае права быць самім сабой. Расслабцеся, не трэба яго выхоўваць. Дзяцей, напрыклад, сталі часцей паказваць на адпачынку, а не ў школе за вучобай. У 1960-х у Саюзе набудавалі тыпавога жылля, і калі савецкія сем'і пераехалі ў добраўпарадкаваныя кватэры, вырашылася шмат бытавых праблем. Дзецям больш не трэба было быць дарослымі — калоць дровы і прыглядваць за малодшымі, таму ім прапанавалі проста глядзець кіно. Да таго ж у кожнай савецкай сям'і з'явіўся тэлевізар, і здарыўся тэлевізійны бум — для дзяцей сталі патокамі здымаць тэлевізійныя фільмы. Нарэшце, у 1980-х накапілася стомленасць, таму рабілі ўсё тое ж, але рабілі класна — тых жа «Госцю з будучыні» альбо «Электроніка». Нарэшце, стала зразумела, што трэба нешта мяняць. Дзіцячае кіно памерла першым, калі грошай не стала, прыйшлі відэамагнітафоны, змянілася эпоха. А калі памерла ўсё астатняе, з'явіліся фільмы пра дзяцей, якія раптам сталі дарослымі і вымушаны

жыць самі па сабе, тут гаварылася на нябачныя дагэтуль тэмы наркаманіі, прастытуцыі, адзіноты. Такім чынам у канцы 1980-х дзеці зноў сталі няшчаснымі, а кіно зноў загаварыла, што дзіця пакутуе ад таго, што мы не можам справіцца з рэчаіснасцю.

— На твой погляд, савецкае дзіцячае кіно можа «зайсці» сучасным дзецям?

— Дзеці маіх сяброў скачуць пад «Прыгоды Бураціна». Ёсць рэчы, што, як ні дзіўна, яшчэ працуюць — у асноўным гэта казкі, бо яны ўніверсальныя і не носяць прыкмет эпохі. Фільмы «Па сакрэце ўсяму свету» альбо «Дзяніскавы апавяданні» дакладна сённяшнім дзецям незразумелыя, для іх гэта ўжо іншая рэальнасць. Але як мінімум «Пра Чырвоную Шапачку» і «Прыгоды Бураціна» мы знялі для ўсіх.

— У беларускага дзіцячага кіно быў свой перыяд росквіту — калі ён здарыўся і з чым гэта было звязана?

— Усё сышлося ў 1970-х. «Беларусьфільм» пераехаў у новы будынак, з'явіліся рэсурсы і магутнасці, тут працавалі таленавітыя рэжысёры і крутая рэдактарская служба, што здабывала добрыя сцэнарыі, — і здарыўся выбух усяго, у тым ліку дзіцячага кіно. Яшчэ ў пачатку 1960-х на кінастудыю прыйшоў Уладзімір Бычкоў, у якога быў талент здымаць для дзяцей, у 1970-х з'явіліся Мікалай Калінін, Леанід Нячаеў, Генадзь Харлан. Уся сістэма, пры тым, што ў ёй былі канфлікты і групоўкі, якія між сабой не сябравалі, выдатна працавала, таму з'явіліся дзясяткі цудоўных фільмаў для дзяцей — «Корцік» і «Бронзавая птушка» Калініна, «Зімародак» Вячаслава Нікіфарава, «Расклад на паслязаўтра» Ігара Дабралюбава, «Па сакрэце ўсяму свету», фільмы Нячаева.

«У канцы 1980-х дзеці зноў сталі няшчаснымі, а кіно зноў загаварыла, што дзіця пакутуе ад таго, што мы не можам справіцца з рэчаіснасцю».

— Ты ахарактарызавала сваю кнігу як спробу адказаць на пытанне, якога гледача вырасціла савецкае дзіцячае кіно. Думаеш, яно сапраўды сыграла сваю ролю ў фарміраванні людзей?

— Так, кіно дае вобразы, да якіх вяртаешся дарослым, мы добра запамінаем тое, што глядзелі ў дзяцінстве. Я, напрыклад, стала разумець, адкуль некаторыя мухі ў галаве маёй мамы: яна нарадзілася пасля вайны і належыць да пакалення піянераў-герояў, якія абстрактную грамадскую ідэю ставяць вышэй за ўсё і ў кожнай справе здзяйсняюць подзвіг. Вядома, маю маму сфарміравалі не толькі дзіцячыя фільмы, але кіно было часткай выхаваўчай савецкай сістэмы. Мне ідэалы мамы ўжо падаюцца дзіўнымі, бо я не расла з візуальнымі вобразамі накшталт партызанскага памочніка Валодзі Дубініна ў фільме «Вуліца малодшага сына» Льва Голуба. Я мела іншыя прыклады — Бураціна, які не здзяйсняў ніякіх подзвігаў, а проста ішоў, не дайшоў, вярнуўся, і яму чамусьці «абламіўся» скарб. Вось і я чакаю, калі мне «абломіцца» скарб. У цэлым савецкае кіно вырасціла гледача, які вельмі спадзяецца, што рэальнасць добрая, ідэалістычная, сацрэалістычная, а ў выпадку чаго — прыйдзе дарослы і ўсё выправіць.

— А ці ёсць у нас сёння дзіцячае кіно?

— Сёння мы намагаемся вярнуць былое, не разумеючы, што як раней ужо не будзе. Спроба аднавіць размову з дзецьмі павінна падтрымлівацца, але яны змяніліся, у іх іншыя інтарэсы і іншая рэальнасць, якую наша кіно не разумее. Звычайна сучасныя дзіцячыя фільмы ўяўляюць сабой кальку з дарослага жыцця, маўляў, спарадзіруем яго і дзецям будзе смешна. Калі ў савецкі час з дзецьмі стараліся абмяркоўваць нейкія тэмы, то цяпер іх проста забаўляюць, каб яны добра прабавілі час і пажадана без складаных эмоцый — ім прапаноўваюць не адчуць смутак, скруху ад страты ці віну, а толькі парагатаць над тым, як людзі выпутваюцца з клаўнады, што эмацыянальна абядняе. Сітуацыя нагадвае 1930-я, калі сістэме было па вялікім рахунку пляваць, што там дзеці думаюць і якія ў іх праблемы, — яна сама сабе расказвала пра цудоўную савецкую краіну і як у ёй трэба жыць. Сёння зноў і аўтар, і адрасат нікому незразумелыя, нават сам фільм як бы непатрэбны. Беларускім дзіцячым кіно мы расцім неразборлівага ў сваіх эмоцыях чалавека, але, дзякуй богу, яго ніхто не глядзіць, таму ўрон невялікі.

Гутарыла Ірэна КАЦЯЛОВІЧ.

Юбілей

Беларусы і палякі сумесна прачыталі «Пана Тадэвуша»

Акцёры Купалаўскага тэатра разам з калегамі з беластоцкага тэатра імя Аляксандра Венгеркі прачыталі «Пана Тадэвуша» анлайн. Чытанне прайшло 21 мая як частка святкавання Купалаўскім свайго 100-гадовага юбілею. Такім фарматам тэатр замяшчае запланаваныя на соты сезон абменныя гастролі з тэатрамі-партнёрамі, якія былі адменены праз распаўсюджванне каранавіруса.

Беларусы чыталі паэму на беларускай мове, а палякі — на польскай, то-бок на мове арыгінала. Калі творы Адама Міцкевіча дагэтуль рознага кшталту довадамі дзеляцца паміж нашымі краінамі, то праз сумеснае чытанне сцвярджаюцца як сумесная спадчына.

Падзея адбылася па ініцыятыве Купалаўскага тэатра пры падтрымцы Польскага інстытута ў Мінску. Ад Купалаўскага «Пана Тадэвуша» чыталі народны артыст Беларусі Аляксандр Падабед, Павел Харланчук-Южакоў, Марта Голубева і Крысціна Дробыш.

Драматычны тэатр імя Аляксандра Венгеркі прадстаўлялі актрысы Крыстына Кацпровіч-Сакалоўская, Данута Бах, Іаланта Бароўская і Катажына Мікевіч. У чытанні былі таксама рэжысёр Алена Ганум і журналісты Польскага радыё Беласток Дарота Сакалоўская і Зміцер Косцін у якасці мадэратараў з польскага боку.

Трэба дадаць, што з найбуйнейшым творам Адама Міцкевіча «Пан Тадэвуш» купалаўцы выступаюць не ўпершыню: у 2014 годзе рэжысёр і мастацкі кіраўнік тэатра Мікалай Пінігін паставіў паводле паэмы аднайменны спектакль. Купалаўскі працягне прапаноўваць альтэрнатывы традыцыйнаму тэатральнаму жыццю — яго ініцыятывы лепш шукаць на сайце калектыва.

Вольга МІЦКЕВІЧ.

На сцэне

Шэкспір, дзень нараджэння Вялікага і опера Бернстайна

Пяць тэатраў, у якія можна схадзіць анлайн на будучым тыдні

Ковід не спыняецца, таму мы ўсё яшчэ вымушаны трымацца альтэрнатыўных варыянтаў культурнага баўлення часу. І трэба сказаць, альтэрнатыва аказваецца не такой сумнай, пакуль мы можам, седзячы на канапе, глядзець тэатральныя пастаноўкі з усяго свету — як з найвядомейшых пляцовак, так і ад калектываў-«адкрыццяў». Вядома, паводле пэўнага падыходу глядзець спектакль на плоскім экране — тое ж, што вывучаць жывапіс па рэпрадукцыях у кнізе, але такі фармат усё яшчэ прапануе гледачу нябачаную раней разнастайнасць. Таму на наступным тыдні прапануем зрабіць яшчэ некалькі выхадаў у тэатр і ў падборцы з пяці пастановак, даступных для бясплатнага прагляду анлайн, збіраем балет, Шэкспіра, Дзень нараджэння нашага Вялікага, Леанарда Бернстайна і «самы шакавальны» спектакль лонданскай сцэны.

«Макбет» у тэатры «Берлінер Ансамбль».

«Рамэа і Джульета» ў Фінскай нацыянальнай оперы

Тыя, хто цікавіцца операй і балетам, напэўна, ужо паглядзелі запісы сусветна вядомых пляцовак у Вене, Лондане, Берліне альбо Метраполітэн-опера. Але выдатных тэатраў, што ставяць гэтыя жанры, куды больш, і мы прапануем адкрыць адзін з іх — Фінскую нацыянальную оперу, гісторыя якой пачалася яшчэ ў XIX стагоддзі. Сёння ў калектыве, што налічвае 530 чалавек, 78 балетных танцораў, і іх работу можна ўбачыць на сайце тэатра oopperabaletti.fi, дзе выкладзена некалькі пастановак, сярод якіх бессмяротны сюжэт Уільяма Шэкспіра і адпаведны балет Сяргея Пракоф'ева «Рамэа і Джульета». Трагедыя дваіх закаханых даступная для прагляду да 18 лістапада, а апроч гэтага ў Фінскай оперы можна паглядзець балеты «Жызэль», «Сон у летнюю ноч» ды іншыя пастаноўкі.

«Макбет» у «Берлінер Ансамбль»

«Берлінер Ансамбль» — адзін з самых вядомых нямецкіх тэатраў. Ён быў заснаваны ў 1949 годзе класічным ужо драматургам Бертольдам Брэхтам і дагэтуль, апроч іншага, ставіць п'есы свайго заснавальніка. Але цяпер паказваецца не Брэхт, а шэкспіраўскі «Макбет» — трагедыя пра караля Макбета і яго прагу ўлады, з-за якой ён разам з жонкай здзяйсняе шэраг крывавых распраў. У крыві ды ў пінжаку вы яго і ўбачыце — «Берлінер Ансамбль» ставіць усё ж не Шэкспіра, а яго адаптацыю, здзейсненую вядомым нямецкім драматургам, рэжысёрам і, дарэчы, пераемнікам Брэхта Хайнерам Мюлерам. Пастаноўку з перакладам на англійскую мову можна паглядзець на сайце «Берлінер Ансамбль» berliner-ensemble.de да 28 мая.

«Дзень адкрытых дзвярэй» у нашым Вялікім тэатры

Не спектакль, але тым не менш падзея — ужо некалькі гадоў запар 25 мая беларускі тэатр оперы і балета адзначае свой дзень нараджэння ў фармаце «Дня адкрытых дзвярэй». Звычайна, каб адкрыць для сябе тэатральнае закуліссе, будынак наведвае некалькі тысяч чалавек, што стала своеасаблівай традыцыяй. Сёлета праз каранавірус звычайны фармат не можа быць вытрыманы, але адмаўляцца ад традыцыі калектыў не стаў: «Дзень адкрытых дзвярэй» пройдзе так ці інакш. У панядзелак на сайце і на старонках Вялікага ў сацыяльных сетках закуліссе можна будзе ўбачыць анлайн, тым больш што работа тэатра не спыняецца. Тут будзе паказаны шэраг інтэрв'ю — з мастацкім кіраўніком Валянцінам Елізар'евым, галоўным балетмайстрам Юрыем Траянам, галоўным хармайстрам Нінай Ламановіч, салістамі Ігарам Артамонавым, Канстанцінам Кузняцовым, Аксанай Волкавай і іншымі — і вячэрні канцэрт-сюрпрыз, у якім выканаўцы прадставяць свае любімыя нумары розных жанраў. «Дзень адкрытых дзвярэй» пачнецца а трэцяй гадзіне, а канцэрт — а сёмай.

«Хваляванні на Таіці» ў «Паўночнай оперы»

Брытанская «Паўночная опера», што месціцца ў горадзе Лідс, да канца месяца паказвае гадзінную оперу «Хваляванні на Таіці». Твор у сярэдзіне мінулага стагоддзя напісаў Леанард Бернстайн — ён паглыбляецца ў жыццё амерыканскага сярэдняга класа і з джазавымі матывамі расказвае пра канкрэтную сям'ю, у якой закаханыя адно ў аднаго муж-бізнесмен і жонка — хатняя гаспадыня тым не менш перажываюць крызіс шлюбу. На сцэне разыгрываецца адзін дзень з жыцця сям'і са сваркамі, спрэчкамі і паходам у кінатэатр на фільм «Хваляванні на Таіці». Кажуць, што матыў для напісання оперы Бернстайну даў уласны досвед альбо, ёсць версія, досвед яго бацькоў. Паглядзець запіс з англійскімі субцітрамі — ён будзе даступны да 1 чэрвеня ўключна — можна на сайце operanorth.co.uk.

Cyprus Avenue у лонданскім Каралеўскім прыдворным тэатры

The Guardian у свой час назвала «Кіпрскую авеню» найбольш шакавальным спектаклем на лонданскай сцэне — гэта было ў 2016 годзе, калі рэжысёр Вікі Фезерстоўн у Royal Court Theatre альбо, можна сказаць, Каралеўскім прыдворным тэатры паставіў «чорную» камедыю Дэвіда Айрлэнда, якая ўтрымлівае нецэнзурную лексіку, сцэны гвалту і абмеркаванне рэлігіі. Па сюжэце галоўны герой Эрык Мілер у выніку памутнення розуму прымае сваю пяцітыднёвую ўнучку за палітыка Джэры Адамса і праз экстрэмісцкае мінулае адчувае, што знаходзіцца ў небяспецы і мусіць дзейнічаць. Як характарызуюць яе стваральнікі, гэта пастаноўка пра чалавека, што мусіць змагацца са сваім мінулым і баіцца будучыні. Спектакль з англійскімі субцітрамі ў кінаадаптацыі можна паглядзець на сайце royalcourttheatre.com.

Вольга МІЦКЕВІЧ.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

Открытое акционерное общество «Борисовский завод полимерной тары «Полимиз» (Продавец, организатор торгов) ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН ПО ПРОДАЖЕ ПРОИЗВОДСТВЕННОГО ОБОРУДОВАНИЯ, расположенного по адресу: Минская область, г. Борисов, ул. Р. Ибаррури, 42, в составе:

ЛОТ № 1: Лакировальная печатная машина Gramex.
Начальная цена – 512 288,00 белорусского рубля без учета НДС.

ЛОТ № 2: Устройство экспонирования CDI Spark 4835 (в комплекте).
Начальная цена – 361 568,00 белорусского рубля без учета НДС.

ЛОТ № 3: Бобинорезательная машина Easy Slit.
Начальная цена – 210 000,00 белорусского рубля без учета НДС.

ЛОТ № 4: Устройство для испытания герметичности ПНД.
Начальная цена – 198 474,00 белорусского рубля без учета НДС.

ЛОТ № 5: Устройство для испытания герметичности ПНД.
Начальная цена – 151 163,00 белорусского рубля без учета НДС.

ЛОТ № 6: Четырехцветная флексографическая машина с сушками УФ (UV) лучей, коронатором и ракельными ножами.
Начальная цена – 153 000,00 белорусского рубля без учета НДС.

ЛОТ № 7: Выдувная машина для изготовления ПНД бутылки.
Начальная цена – 353 000,00 белорусского рубля без учета НДС.

ЛОТ № 8: Машина для продольной резки пленки BJL-P1000.
Начальная цена – 147 000,00 белорусского рубля без учета НДС.

ЛОТ № 9: Комплект форм для изготовления ПНД (10 шт.).
Начальная цена – 54 000,00 белорусского рубля без учета НДС.

ЛОТ № 10: Комплект форм для изготовления ПНД (12 шт.).
Начальная цена – 64 800,00 белорусского рубля без учета НДС.

ЛОТ № 11: Комплект форм для изготовления ПНД (6 шт.).
Начальная цена – 67 200,00 белорусского рубля без учета НДС.

ЛОТ № 12 Криогенная установка Polycold 2000.
Начальная цена – 20 000,00 белорусского рубля без учета НДС.

ЛОТ № 13 Водоохладитель TWA 302 B/SPU.
Начальная цена – 33 000,00 белорусского рубля без учета НДС.

Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах:

Заявления на участие и необходимые документы в соответствии с постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.01.2013 № 16 принимаются **по 23.06.2020** в рабочие дни с 10.00 до 15.00 по адресу: 246017, г. Гомель, ул. Красноармейская, д. 7.

Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены (шаг 5 %). Торги проводит ликвидатор. В процессе торгов начальная цена повышается до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов. К указанной цене добавляется НДС. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество.

Задаток в размере 0,01 % от стоимости лота перечисляется на расчетный счет Продавца: BY98ALFA30122095570070270000 в ЗАО «Альфа-Банк», г. Минск, БИК ALFABY2X.

По результатам проведения торгов оформляется протокол. С победителем торгов в срок не позднее 10 рабочих дней заключается договор.

Оплата приобретенного предмета торгов с учетом НДС осуществляется не позднее 6 (Шести) месяцев с даты заключения договора.

В случае если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником или для участия в них явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику (покупателю) при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Аукцион состоится 26.06.2020 в 11.00 по адресу: Минская область, г. Борисов, ул. Р. Ибаррури, 42 (актовый зал).

Осмотр имущества осуществляется по месту нахождения имущества по предварительной договоренности по тел. +375296555051.

Извещение о проведении 03 июня 2020 года повторных торгов с условиями по продаже помещений физкультурно-оздоровительного и спортивного назначения, принадлежащих ОАО «Стройтрест № 35»

Сведения о предмете торгов (продаваемом имуществе)				
№ предмета торгов	Наименование и характеристики имущества, входящего в состав предмета торгов	Местонахождение продаваемого имущества	Начальная цена, бел. руб., с учетом НДС	Размер задатка, бел. руб.
1	Изолированное помещение общей площадью 954,2 кв. м с инвентарным номер в ЕГРНИ 500/D-798183944, наименование – спортивный зал (баскетбол)	г. Минск, ул. Стадионная, 3-1	1 502 635,20	150 000,00
2	Изолированное помещение общей площадью 694,7 кв. м с инвентарным номером в ЕГРНИ 500/D-798183945, наименование – спортивный зал (теннис)	г. Минск, ул. Стадионная, 3-2	1 036 213,20	103 000,00
3	Изолированное помещение общей площадью 263,8 кв. м с инвентарным номером в ЕГРНИ 500/D-798183946, наименование – многофункциональный зал	г. Минск, ул. Стадионная, 3-3	453 816,00	45 000,00

Продавец имущества: ОАО «Стройтрест № 35», ул. Я. Коласа, 38, 220013, г. Минск.

Организатор торгов: государственное предприятие «МГЦН», ул. К. Маркса, 39, к. 10, 220030, г. Минск.

Условие торгов: победитель торгов (покупатель) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 1 процента от цены продажи предмета торгов, указанной в протоколе о результатах торгов, в течение 3 рабочих дней со дня проведения торгов.

Торги проводятся в соответствии со ст.ст. 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения аукциона по продаже имущества, принадлежащего ОАО «Стройтрест № 35», утвержденным организатором торгов.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, внесшие задаток и заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона по соответствующему предмету торгов, а также представившие организатору торгов следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию платежного документа о внесении задатка, документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица; а также при необходимости иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

Задаток (задатки) перечисляется на расчетный счет государственного предприятия «МГЦН» № BY34 BPSB 3012 1049 7101 9933 0000 в Региональной Дирекции № 700 по г. Минску и Минской области ОАО «БПС-Сбербанк», БИК BPSBBY2X, в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе.

Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов и включает НДС. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

В случае если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником или для участия в них явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику (покупателю) при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) заключается после предъявления копии платежных документов о перечислении суммы вознаграждения за организацию и проведение торгов и подписывается в течение 10 рабочих дней со дня проведения торгов.

Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (покупателем) в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи.

Торги проводятся **03 июня 2020 года** в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются **с 25.05.2020 по 02.06.2020** включительно в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.30) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

По вопросу ознакомления с продаваемым имуществом следует обращаться по телефону (029) 611-50-44.

Телефоны для справок:

(017) 327-48-36 (государственное предприятие «МГЦН»); (029) 611-50-44 (ОАО «Стройтрест № 35»).

Извещение о проведении 23 июня 2020 года торгов с условиями по продаже жилых помещений (квартир), принадлежащих ОАО «МАПИД»

Сведения о предмете торгов (продаваемом имуществе)			
№ предмета торгов	Наименование, характеристики и местонахождение продаваемого имущества	Начальная цена, бел. руб.	Размер задатка, бел. руб.
1	«Квартира 1» по адресу: г. Минск, ул. Космонавтов, 20-1 (1 этаж, четырехкомнатная, общая площадь – 90,1 кв. м, общая площадь по СНБ – 98,0 кв. м, инвентарный номер 500/D-798805145)	264 600,00	3 000,00
2	«Квартира 14» по адресу: г. Минск, ул. Космонавтов, 20-14 (1 этаж, четырехкомнатная, общая площадь – 90,0 кв. м, общая площадь по СНБ – 98,0 кв. м, инвентарный номер 500/D-798805158)	264 600,00	3 000,00
3	«Квартира 23» по адресу: г. Минск, ул. Космонавтов, 20-23 (1 этаж, четырехкомнатная, общая площадь – 90,1 кв. м, общая площадь по СНБ – 98,0 кв. м, инвентарный номер 500/D-798805167)	264 600,00	3 000,00
4	«Квартира 36» по адресу: г. Минск, ул. Космонавтов, 20-36 (1 этаж, четырехкомнатная, общая площадь – 90,0 кв. м, общая площадь по СНБ – 98,0 кв. м, инвентарный номер 500/D-798805180)	264 600,00	3 000,00
5	«Квартира 1» по адресу: г. Минск, ул. Космонавтов, 22-1 (1 этаж, четырехкомнатная, общая площадь – 90,1 кв. м, общая площадь по СНБ – 98,1 кв. м, инвентарный номер 500/D-798803712)	264 870,00	3 000,00

Шаг аукциона: 5 000,00 бел. руб.

Продавец имущества: ОАО «МАПИД», ул. Р. Люксембург, 205, 220036, г. Минск.

Организатор торгов: государственное предприятие «МГЦН», ул. К. Маркса, 39, к. 10, 220030, г. Минск.

Условия торгов:

1. Победитель торгов (покупатель) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 1 процента от цены продажи предмета торгов, указанной в протоколе о результатах торгов, в течение 3 рабочих дней со дня проведения торгов.

2. Расходы, связанные с государственной регистрацией договора купли-продажи и основанных на нем прав, оплачиваются победителем торгов (покупателем).

Торги проводятся в соответствии со ст.ст. 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения аукциона по продаже имущества, принадлежащего ОАО «МАПИД», утвержденным организатором торгов.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, включая индивидуальных предпринимателей, внесшие задаток по соответствующему предмету торгов и заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (далее – соглашение), а также представившие организатору торгов следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию платежного документа о внесении задатка (задатков); документы, подтверждающие полномочия представителя юридического или физического лица (для физического лица – документ, удостоверяющий личность; для представителя физического лица – документ, удостоверяющий личность представителя и нотариально заверенная доверенность; для представителя юридического лица – доверенность, выданная юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица), а также, при необходимости, иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

Задаток (задатки) перечисляется на расчетный счет государственного предприятия «МГЦН» № BY34 BPSB 3012 1049 7101 9933 0000 в Региональной Дирекции № 700 ОАО «БПС-Сбербанк» по г. Минску и Минской области, БИК BPSBBY2X, 220035, г. Минск, пр. Машерова, д. 80, УНП 190398583 в срок, установленный для приема документов на участие в торгах (назначение платежа – задаток для участия 23.06.2020 в аукционных торгах по продаже жилых помещений по предмету торгов №__).

Участнику, не ставшему победителем торгов (покупателем), внесенный задаток (задатки) возвращается в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов.

Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. Не допускается продажа предмета торгов по начальной цене. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

В случае, если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником или для участия в них явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику (покупателю) при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

С победителем торгов (покупателем) в течение 10 рабочих дней со дня проведения торгов заключается авансовое соглашение купли-продажи жилого помещения (по форме, установленной продавцом имущества).

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) заключается в течение 10 рабочих дней со дня поступления (зачисления на расчетный счет продавца имущества) от победителя торгов (покупателя) суммы аванса в соответствии с авансовым соглашением.

В случае, если победитель торгов (покупатель) не заключил авансовое соглашение, результаты аукциона аннулируются, внесенный задаток остается в распоряжении продавца имущества.

Торги проводятся **23 июня 2020 года в 16.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются **с 25.05.2020 по 18.06.2020** включительно в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.30) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

Осмотр продаваемого имущества будет производиться 03.06.2020 с 10.00 до 12.00 и 17.06.2020 с 14.00 до 16.00 по адресу: г. Минск, ул. Космонавтов, 20, 22.

Телефоны для справок: (017) 327-40-22, (017) 327-48-36, (государственное предприятие «МГЦН»); (017) 256-62-36, (017) 209-87-32, (017) 208-58-12, (017) 207-16-73 (ОАО «МАПИД»).

Дополнительная информация размещена на официальном сайте организатора торгов – www.mgcn.by.

ВНИМАНИЮ ПРЕДПРИЯТИЙ, ОРГАНИЗАЦИЙ И ИНДИВИДУАЛЬНЫХ ПРЕДПРИНИМАТЕЛЕЙ!

УНП 500042135

Комитетом государственного имущества Гродненского областного исполнительного комитета

проводятся аукционы по продаже неиспользуемого имущества, находящегося в собственности Волковысского района

К ПРОДАЖЕ ПРЕДЛАГАЕТСЯ:

1) Здание нежилое по ул. Матросова, 3 в г. п. Россь Волковысского района.
Начальная цена предмета аукциона – 594 167 руб. 07 коп.
Размер задатка – 59 500 руб.

2) Здание бани с пристройкой, котельная с пристройкой, дымовой трубой, мощение по ул. Пролетарской, 16 в г. п. Красносельский Волковысского р-на.
Начальная цена предмета аукциона – 40 260 руб.
Размер задатка – 4 100 руб.

Аукцион состоится – **25.06.2020 г. в 12.00.**

Заявки на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. 17 Сентября, 39.

Последний день подачи заявлений на участие в аукционе – **19.06.2020 г. до 17.00.**

Подробная информация по телефонам:
в городе Волковыске: 8 (01512) 4 50 25, 2 06 03;
в городе Гродно: 8 (0152) 62 39 24, 62 39 23, 62 39 31.
Дополнительная информация размещена на сайте: https://au.nca.by.

ЗАО «Белреализация» объявляет аукцион

Организатор торгов: **ЗАО «Белреализация»** (УНП 191113330), 220089, г. Минск, ул. Уманская, 54, 4-й этаж паркинга, каб. 27, тел.: (8017) 298-53-53; (8029) 690 54 09, **BELTORGI.BY**

Продавец: ООО «КМ-Интер Запад» (УНП 192301122) в лице ликвидатора ООО «АверсГиС», тел. +375 (29) 119-70-43.

Публичные торги в электронной форме будут проведены **23 июня 2020 г. в 09.00–17.00** на электронной торговой площадке **BELTORGI.BY.**

№ п/п	Предмет торгов	Начальная цена, бел. руб. без НДС
1	Уничтожитель игл и шприцев, 3 шт.	744,72 (с НДС)
2	Контейнер 15 л серый с педалью, 18 шт.	663,93
3	Бак с фикс. крышкой для сбора мед. отх. 4,5 бир. для дезинфекц., 58 шт.	1 187,83
4	Контейнер 7,5 л бирюзовый, 4 шт.	153,08
5	Бак с фикс. крышкой для сбора мед. отх. 7,5 л бир. длядезинфекци, 204 шт.	6 368,88
6	Бак 1,3 л цвет бирюзовый, 147 шт.	3 195,81
7	Емкость-конт. 1,0 л желт., красный для сбора отходов, 69 шт.	245,14
8	Емкость-конт. 1,1 л д/сбора остр. инстр. и орг. отх. кл. Б, 2598 шт.	8 365,56
9	Емкость-конт. 1,1л д/сбора остр. инстр. и орг. отх. кл. Б, 190 шт.	343,85
10	Емкость-конт. 0,6 л желт. цвета д/сбора остр. инструм. класса Б, 979 шт.	2 683,14
11	Емкость-конт. 1,0 л д/сбора остр. инстр. и орг. отх. кл. Б, 129 шт.	207,80
12	Емкость-конт. 1,0 л д/сбора остр. инстр. и орг. отх. кл. Б, 118 шт.	217,13
13	Емк.-конт. желт. цв. 0,25 л д/сбора остр. инстр., 432 шт.	622,04
14	Емкость-конт.100 мл д/сбора остр. инструм. класса Б желт. цвета, 83 шт.	53,10
15	Емкость-конт.3,0 д/сбора остр. инстр. и орг. отх. кл. Б, 5 шт.	13,82
16	Емкость-конт. 0,6 л желт. цвета для сбора отходов, 820 шт.	1 156,28
17	Емкость-конт. 1,5 л д/сбора остр. инстр. и орг. отх. кл. Б, 240 шт.	489,60
18	Емкость-конт. 1,4 л желт. цв. сгор. иглосъемн. д/сбора остр. инстр, 251 шт.	804,58
19	Емкость-контейнер для сбора острого инструментария 1,8 л, 150 шт.	307,35
20	Емкость-контейнер 0,9 л. желтый, 5 шт.	6,78
21	Емкость-контейнер для сбора острого инструментария 0,5 л., 4425 шт.	3 982,51
22	Емкость-конт. 1,0 л желт. цв. д/сбора остр. инструм. класса Б, 50 шт.	128,35
23	Емкость-контейнер для сбора острого инструментария 1,3 л, 192 шт.	349,13

Местонахождение – г. Минск, ул. Бабушкина, 32, тел. для ознакомления +37529 698-53-18.

Для участия в торгах необходимо в срок с 23.05.2020 г. 09.00 по 22.06.2020 г. 17.00: 1) зарегистрироваться и подать заявку по выбранному лоту на участие в торгах на сайте BELTORGI.BY; 2) перечислить задаток по выбранному лоту на р/с BY33BPSB30121854590139330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», код BPSBBY2X, УНП 191113330, получатель – ЗАО «Белреализация».

Шаг торгов – 5 %, задаток – 10 % от начальной цены предмета торгов. Организатор торгов вправе отказаться от их проведения, не позднее чем за день до наступления даты проведения торгов. Торги проводятся при наличии не менее двух допущенных к участию в них участников. Победителем торгов признается лицо, предложившее наиболее высокую цену. Участнику, не выигравшему торги, задаток возвращается в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов. Победителю торгов задаток не возвращается и учитывается при окончательных расчетах по приобретению предмета торгов. Если заявка на участие в торгах подана только одним участником, торги признаются несостоявшимися. Предмет торгов продается претенденту на покупку при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов. Результаты торгов оформляются в виде протокола. Победитель торгов (претендент на покупку) обязан в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов оплатить сумму фактических затрат, связанных с организацией и проведением торгов, и аукционный сбор. Срок заключения договора купли-продажи и оплаты предмета торгов: не позднее десяти рабочих дней со дня проведения торгов.

ІХ ЖЫЦЦЁ — ЯК РАМАН

Якім быў шлях беларускіх алімпійцаў да самых значных перамог

Беларускія спартсмены заваявалі 96 алімпійскіх медалёў: 20 залатых, 32 сярэбраныя і 44 бронзавыя. Імёны алімпійскіх чэмпіёнаў апошняга дзесяцігоддзя вядомыя жыхарам нашай краіны ад малога да вялікага, але не ўсе беларускія алімпійцы маюць такую ж папулярнасць, як Дар'я Домрачава, Вікторыя Азаранка, Андрэй Арамнаў і іншыя. Сёння, роўна за месяц да Міжнароднага Алімпійскага дня, пачынаем серыю публікацый пра беларускіх алімпійскіх чэмпіёнаў мінулых гадоў.

Першым алімпійцам — выхадцам з Беларусі лічыцца Караль Румель, удзельнік Алімпійскіх гульняў 1912 года ў складзе каманды Расійскай імперыі, бронзавы прызёр ІХ Алімпіяды 1928 года ў Амстэрдаме ў складзе каманды Польшчы. А сучасная гісторыя Алімпійскага руху ў нашай краіне пачынаецца з 1952 года, калі ўпершыню савецкія спартсмены, а ў іх ліку і беларусы, прынялі ўдзел у XV летніх Алімпійскіх гульнях у сталіцы Фінляндыі — Хельсінкі. Тады сем нашых суайчыннікаў выступалі ў спаборніцтвах па веславанні на байдарках і каноэ, лёгкай атлетыцы і фехтаванні. Медалёў заваяваць у іх не атрымалася, але затое атрымалася набыць першы вопыт удзелу ў такіх маштабных спаборніцтвах. Ужо ў 1956 годзе беларускія спартсмены адкрылі лік алімпійскім узнагародам на XVI Алімпіядзе ў Мельбурне. Лёгкаатлет Міхаіл Крываносаў быў узнагароджаны сярэбраным медалём у кіданні молата. У 1960 годзе ў Рыме на XVII Алімпійскіх гульнях барэц класічнага стылю ў паўлёгкай вазе Алег Караваеў быў удастоены залатога алімпійскага медаля, чэмпіёнамі таксама сталі весляры (у каноэ-двойцы на дыстанцыі 1000 м) Сяргей Макаранка і Леанід Гейштар, а таксама фехтавальшчыца Таццяна Самусенка.

Працавала ў Эквадоры і Нідэрландах...

Адназначным адказам на пытанне пра самую вядомую беларускую плыўчыху стане імя Аляксандры Герасімені, аднак у нашай краіне ёсць і больш тытулаваная спартсменка ў гэтым відзе спорту. Алена Рудкоўская стала алімпійскай чэмпіёнкай на Гульнях-1992 у Барселоне на дыстанцыі 100 м брасам і бронзавым прызёрам у камбінаванай эстафеце 4х100 м. А да гэтага ўраджэнка Гомеля заваявала тры залатыя медалі чэмпіянату Еўропы на дыстанцыях 100 і 200 м брасам, а таксама ў камбінаванай эстафеце 4х100 м.

У секцыю плавання Алена Рудкоўская прыйшла, калі ёй споўнілася восем гадоў, туды яе прынялі не адразу, таму што палічылі бесперспектыўнай. Праз два гады дзяўчынка ўсё ж вырашыла паўтарыць спробу трапіць у басейн, гэтым разам удала. Праз нейкі час на першынстве Гомельскай вобласці на Алену звярнуў увагу дасведчаны трэнер Леанід Яфімавіч Каўфман, але першая трэніроўка ў яго групе для Рудкоўскай ледзь не аказалася апошняй. Алена адчула, што не можа ўгнацца нават за самымі слабымі яго вучнямі, асабліва калі плылі кролем. Затое ў любімым брасе ёй не было роўных.

Значныя перамогі ў гамяльчанкі пачаліся з юнацкага першынства СССР, якое адбылося ў 1987 годзе ў Грузіі. На дыстанцыі 200 м брасам Алена Рудкоўская аказалася па-за канкурэнцыяй. Так яна трапіла ў зборную краіны. Праз год беларуска магла выйсці на стартавы борцік ужо маладзёжнага чэмпіянату Еўропы ў Нідэрландах, але за тры месяцы да галоўных спаборніцтваў на занятках па агульнай фізічнай падрыхтоўцы, выконваючы серыю заскокаў на бетонны бардзюр, плыўчыха сур'ёзна траўміравала каленны сустаў, што скончылася аперацыяй. Але гэта не зламала спартсменку, і ўжо праз месяц яна была ў выдатнай фізічнай форме. Рудкоўская выходзіла на прыметныя ролі ў СССР, а ў 1991 годзе яна адсвяткавала перамогу на дарослым чэмпіянаце Еўропы ў Афінах на абедзвюх дыстанцыях у брасе — 100 і 200 м, а таксама ў камбінаванай эстафеце. Але пытанне аб тым, ці браць беларуску на Алімпіяду ў Барселону, стаяла да апошняга, тым больш адборачны нарматыў на кантрольных спаборніцтвах Алена не выканала. Аднак трэнеры рызыкнулі і пасля Алімпіяды аб гэтым не пашкадавалі.

Пасля трыумфу ў Барселоне жыццё Алены Рудкоўскай было цікавае і насычанае, яна выкладала ў Эквадоры, сустрэла сваё каханне ў Празе, але, пакалясіўшы па свеце, спынілася ў маленькім галандскім горадзе Вейндам, што ў правінцыі Гронінген. Туды яна пераехала ў 2004 годзе, у Нідэрландах Алена выкладала ўрокі плавання для дзяцей і аквааэробіку для жанчын.



Чэмпіёнка без медаля

«Золата» нумар адзін. Савецкая жанчына, якой няма нават у спісе каманды». Пад такім незвычайным загалоўкам японская газета «Майніці» змясціла на першай паласе фатаграфію Ірыны Шылавай, якая ў першы дзень Алімпіяды-88 стала найлепшай у стральбе з пнеўматычнай вінтоўкі. Здзіўлены рэпарцёр пісаў: «Першай уладальніцай залатога медаля на цяперашніх Алімпійскіх гульнях стала невядомая да гэтага савецкая спартсменка Ірына Шылава. А чакалася, што залаты медаль заваюе «кветка Балгарыі» — чэмпіёнка свету Весела Лечава. На алімпійскае стрэльбішча накіраваліся 500 журналістаў з намерам апісаць подзвігі першай гераіні Гульняў, але Весела была толькі 43-й з 45 удзельніц турніру...»

На сеульскім стрэльбішчы Ірына Шылава зрабіла 50 стрэлаў, трымаючы ў руках 5-кілаграмовую вінтоўку, нібы пушынку, і заваявала сваю самую дарагую спартыўную ўзнагароду ў жыцці. Ураджэнка Гродна з'яўляецца адной з самых тытулаваных спартсменак у стральбе. Яна стала рэкардсменкай не толькі Беларусі, але і свету, і Еўропы, а таксама алімпійскай чэмпіёнкай у Сеуле (Паўднёвая Карэя) у 1988 годзе, двухразовай чэмпіёнкай свету ў асабістых і камандных спаборніцтвах, чэмпіёнкай Еўропы, пяціразовай чэмпіёнкай СССР.

А за 14 гадоў да Сеула худзенькая і невысокая гімнастка-першаразрадніца ўпершыню ўзяла ў рукі грувасткую вінтоўку. Яна прыйшла ў цір выпадкова, але там ёй вельмі спадабалася. Поспехаў маладой дзяўчыне доўга чакаць не прыйшлося, яна хутка стала майстрам спорту, паехала на ўсесаюзную спартакіяду школьнікаў, абыграўшы нават хлопцаў, і перамагла ў фінале трэціх усесаюзных спартыўных гульняў моладзі. У 1982 годзе Ірына ўпэўнена першынствавала на чэмпіянаце СССР у малакаліберным стандарце, але пасля гэтага прыйшла паласа няўдач. «Хтосьці падрапаў ствол вінтоўкі, а новы доўга не давалі. Потым з'явіўся новы, але далёка не найлепшы, і яго цэлы год прыйшлося падганяць. Сезон за сезонам праходзілі бясследна. І тое, што я калісьці з'яўлялася членам зборнай СССР, усімі забылася. А тут яшчэ і канфлікт з трэнерам... Я аказалася на раздарожжы, падумвала нават зачахліць зброю, — расказвала тады спартсменка. — На шчасце, у цяжкую хвіліну мяне падтрымалі родныя і блізкія. Яшчэ адзін чалавек, дзякуючы якому не пакінула спорт, — маскоўскі трэнер Віктар Пятровіч Авілаў. З ім я і рыхтавалася да Сеула».

З 1986 года Ірына Шылава пачала новае ўзыходжанне. Яна вярнула сабе званне чэмпіёнкі краіны, абнавіла некалькі ўсесаюзных рэкордаў. Асноўны ўпор у падрыхтоўцы зрабіла на пнеўматыку, хоць і ў гэтым відзе стральбы канкурэнтак у яе хапала. Некаторыя добразычліўцы казалі ёй у вочы: «Ну, чаго ты, малавядомая, ды яшчэ з перыферыі, без пастаяннага трэнера можаш дасягнуць?» Але гэта толькі гартавала характар. На галоўных адборачных спаборніцтвах — чэмпіянаце краіны ў Мыцішчах — беларуска не толькі выйграла ў знакамітых саперніц, але і ўстанавіла два ўсесаюзныя рэкорды. Алімпіяда ў Сеуле стала для Ірыны Шылавай трыумфам у спартыўнай кар'еры. «Лепшай Алімпіяды я не памятаю, хоць і была на чатырох. Не таму, што выйграла, мне падабалася ў Сеуле літаральна ўсё — і горад, і вёска атлетаў, і людзі, і кухня. Прыемна, што на стэле алімпійскіх чэмпіёнаў, якая цяпер стаіць у Сеуле, выбіта і маё прозвішча», — успамінае Ірына Алегаўна.

На наступных трох Алімпіядах да медалёў беларусцы наблізіцца не ўдалося. «Я выступала ўжо за Беларусь — маладую краіну, якая, па сутнасці, усё пачынала з нуля. Патроны, вінтоўкі — усё засталося ў Савецкім Саюзе. Не, зброю ў нас ніхто не забраў, але вінтоўка ў любым выпадку патрабуе мадэрнізацыі. Мой трэнер застаўся ў Расіі, і я выцягвала толькі за кошт вопыту».

Пасля Алімпіяды ў Сеуле кватэру Шылавай абакралі, у тым ліку знік і алімпійскі медаль. Сваю кар'еру Ірына скончыла ў 45, але працягвала ездзіць па краіне яшчэ 10 гадоў: кажа, што страляла для таго, каб стварацца моладзі канкурэнцыю і спадзявалася, што яе досвед камусьці спатрэбіцца. Пасля гэтага нейкі час алімпійская чэмпіёнка прапрацавала ў прадстаўніцтве НАКа ў Гродзенскай вобласці, а пасля разам з мужам пераехала ў Беласток.

Свае перамогі бачыў у сне

Унікальным весляром называюць Уладзіміра Уладзіміравіча Парфяновіча, які тройчы ўздымаўся на найвышэйшую прыступку п'едэстала гонару Алімпійскіх гульняў у Маскве. Залатыя медалі ён заваяваў у байдарцы-адзіночцы на 500 м і байдарцы-двойцы з украінцам Сяргеем Чухраем на 500 і 1000 м. Беларус стаў дзевяціразовым чэмпіёнам свету, дзевяціразовым чэмпіёнам Еўропы, сямнаццаціразовым чэмпіёнам СССР.

У дзяцінстве Уладзімір марыў аб спартыўных перамогах, але не на вадзе, а на барцоўскім дыване. Тры гады ўпарта трэніраваўся, але аднойчы захварэў і вымушана прапусціў заняткі. У барцоўскую залу ён больш не вярнуўся, бо пабаяўся, што за «прагул» на яго пачнуць сварыцца і выганяць з секцыі. Будучы чэмпіён жыў у сталіцы недалёка ад Камсамольскага возера, таму неўзабаве адправіўся ў веславанне. Першая спроба ў маі 1973 года аказалася няўдалай, трэнер, які набіраў хлопцаў, не ўбачыў у Валодзю будучага чэмпіёна. Хлапчук не здаўся, прыйшоў яшчэ раз, у лютым, і ўсё ж такі сеў у байдарку. Першыя спартыўныя поспехі прыйшлі да яго яшчэ на дзіцячых спаборніцтвах, а ў зборную Савецкага Саюза Парфяновіч трапіў у 18 гадоў. Яму ўдалося выйграць два міжнародныя старты і тым самым заявіць пра сябе. Годам пазней Уладзімір Парфяновіч выпусціў перамогу толькі на адных спаборніцтвах — чэмпіянаце свету. Але пасля гэтага нікому не дазваляў перамагаць сябе ў адзіночцы. Праблема адбору на маскоўскую Алімпіяду перад Уладзімірам Парфяновічам не стаяла, у Савецкім Саюзе ў яго ўжо не было канкурэнтаў, у адзіночцы ён выйграваў ва ўсіх. Да 1983 года першынствaваў на ўсіх стартах, у якіх прымаў удзел, уключаючы кантрольныя. Дзіўны факт: з нейкага моманту ўсе свае галоўныя старты Уладзімір Уладзіміравіч стаў бачыць у сне. За 20 дзён да пачатку Алімпіяды ён ужо «прагледзеў», як усё складзецца. «На гэтай Алімпіядзе мы заваявалі апошнюю для савецкай зборнай сімвалічную васьмідзясятую залатую ўзнагароду. Я з удзячнасцю ўспамінаю ўрокі, дадзеныя мне выдатным майстрам веславання Сяргеем Чухраем», — успамінае Уладзімір Уладзіміравіч. На маскоўскай Алімпіядзе Парфяновіч з Сяргеем Чухраем завяршылі сумесную кар'еру. Беларус развітаўся са спортам даволі рана, у 26 гадоў. «Я стаміўся. Перастаў хвалявацца на старце. Раней калаціўся, сэрца стукала, мандраж... Калі знікае гэта пачуццё, трэба заканчваць», — кажа ён.

Пасля заканчэння кар'еры спартсмена Парфяновіч займаўся палітыкай, узначальваў федэрацыю веславання на байдарках і каноэ Беларусі, працаваў трэнерам.

Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.

З жыцця жывёл

Без экскурсій і фестываляў

Як працуе сталічны заапарк падчас пандэміі

У ганконгскім заапарку Ocean Park, апусцелым з-за адсутнасці наведвальнікаў падчас каранціну, пачалі спарвацца гіганцкія панды. Самец Ле Ле і самка Ян Ян жывуць у Ocean Park ужо 14 гадоў. На працягу апошніх дзесяці служыцелі спрабавалі прымусіць іх да гэтага, але беспаспяхова. І толькі цяпер, калі не стала наведвальнікаў, у жывёл прачнуўся інстынкт размнажэння. Супрацоўнікі Мінскага заапарка падчас пандэміі таксама заўважылі змены ў паводзінах сваіх падапечных — апошнія... не хаваюць сваёй радасці. Карэспандэнт газеты «Звязда» даведалася, як яшчэ змянілася жыццё жывел і якія перамены адбыліся ў Мінскім заапарку падчас пандэміі.

— У нас наведвальнікаў стала менш, чым у той жа перыяд мінулага года, — расказвае **малодшы навуковы супрацоўнік Мінскага заапарка Аксана БУКА.** — Тут і звычайна наплыў людзей непастаянны: у халодныя дні — менш, у сонечныя — больш. Але наш заапарк працягвае жыць, і цяпер пачынаецца перыяд, калі жывёлы пераязджаюць у свае летнія вальеры. Вядома, для нашых падапечных незвычайна тое, што на іх не глядзіць так шмат вачэй, як раней, і яны гэтаму вельмі рады — відаць па іх. У некаторых жывёл цяпер актыўны перыяд размнажэння, і іх ніхто не бянтэжыць. Нядаўна на свет з'явіліся паласатыя мангусцікі, зацяжарылі козкі, з сумкі маці вылез маленькі кенгуру.

Мінскі заапарк практычна працуе ў штатным рэжыме — ён не вымушаны здабываць ежу для сваіх гадаванцаў, як у некаторых іншых краінах, бо з'яўляецца бюджэтнай арганізацыяй. А, напрыклад, нямецкія заапаркі ўжо звярталіся да канцлера Германіі Ангелы Меркель з просьбай вылучыць для іх фінансавую дапамогу ў памеры сотні мільёнаў еўра. У сумесным звароце, накіраваным канцлеру, гаворыцца, што праз адсутнасць наведвальнікаў заапаркі пазбавіліся асноўнага даходу, неабходнага для догляду жывёл і набыцця корму.

У падобным становішчы апынуўся і Лонданскі заапарк, які ў сваёй гісторыі перажыў дзве сусветныя вайны і закрываўся толькі на вельмі непрацяглы час. Ва ўмовах пандэміі заалагічнае таварыства Лондана абвясціла аб зборы сродкаў на падтрыманне работы навуковага комплексу і догляду жывёл. Працяглы рэжым ізаляцыі і каранціну называюць катастрафічным сцэнарыем для брытанскіх заапаркаў, якія ў асноўным спадзяваліся на даходы ад наведвальнікаў.

З падобнымі праблемамі сутыкнуліся і ў Расіі. Заапаркі, сафары-паркі, рэабілітацыйныя цэнтры і прытулкі для дзікіх і свойскіх жывёл пасля таго, як Расія сышла на каранцін, адчуваюць цяжкасці. Усе ўстановы, якія жылі з продажу білетаў, ва ўмовах рэжыму самаізаляцыі насельніцтва могуць нават не выжыць. У першую чаргу гэта датычыцца прыватных кампаній, якія зарабляюць на відовішчнасці. Наведвальнасць упала да нуля, датацыі спонсараў рэзка скараціліся. Між тым у прыватным кантактным заапарку ZOOпарк, што ў Мінску, такой праблемы не ўзнікае. «Канешне, наведвальнікаў стала менш, але гэта ніяк не паўплывала на жыццё жывёл, — сказала **начальнік заатэхнічнага аддзела Марына МАКСІМОВІЧ.** — Нашым жывёлам хапае ўсяго неабходнага, і сродкі на іх утрыманне ёсць».

Што датычыцца бяспекі наведвальнікаў, у цэнтральным Мінскім заапарку апрацоўваюць дэзынфіцыруючымі сродкамі ўсе элементы, да якіх можа дакрануцца чалавек, некалькі разоў у дзень.

— Заапарк вялікі, і на гэта патрабуецца проста велізарная колькасць антысептыку, — гаворыць Аксана Бука. — Для жывёл гэтыя сродкі бяспечныя, таму што яны проста не дакранаюцца да поручняў. У нас няма такога правіла, каб наведвальнікі прыходзілі ў масках і пальчатках, бо тут адкрытая тэрыторыя. Людзі вырашаюць самі пытанні сваёй бяспекі. Але многія выкарыстоўваюць сродкі індывідуальнай аховы, і часцей за ўсё імі карыстаюцца ў тэрарыуме і акварыуме, якія знаходзяцца ў закрытым будынку.

Перамены ў рабоце заапарка таксама ёсць. Падчас пандэміі адмянілі ўсе экскурсіі і іншыя масавыя мерапрыемствы, якія былі запланаваны. Напрыклад, фестываль «Экалогія. Творчасць. Дзеці», які стаў ужо традыцыйным і павінен быў прайсці ў красавіку, перанеслі на верасень. Але, нягледзячы на вымушаныя абмежаванні, супрацоўнікі заапарка стараюцца прыцягнуць наведвальнікаў і пры гэтым клапоцяцца аб іх бяспецы.

«Мы запусцілі на старонцы ў «Інстаграме» зоамарафон, — разказвае супрацоўніца заапарка. — У нас ужо ёсць і пераможцы, якія атрымаюць квіток у заапарк. Яшчэ мы вырашылі праводзіць анлайн майстар-класы для дзяцей. У дзень абароны дзяцей, канешне, мы адмянілі маштабныя масавыя мерапрыемствы, але распрацавалі «індывідуальны дзіцячы квэст». Ён вельмі лёгкі і цікавы, бацькі са сваім малым могуць прайсціся па заапарку, выконваючы розныя заданні. Такі квэст дае магчымасць як мага менш сутыкацца з іншымі наведвальнікамі».

У заапарку і сапраўды цяжка сутыкнуцца з наведвальнікамі, асабліва ў дажджлівы дзень. Але ж сустракаем сямейную пару з дзецьмі.

— Я вельмі рады, што заапарк працягвае сваю работу нават падчас пандэміі, — гаворыць Міхаіл. — Мы прыходзілі з сынам на дельфінатэрапію. Майму малому гэта неабходна, бо ў яго аўтызм. Тут спецыялісты высокага ўзроўню, і наш сын ідзе з імі на кантакт. Бачна, што наведвальнікаў стала менш, але мне вельмі прыемна, што ў людзей ёсць магчымасць самім прымаць рашэнне: наведваць такія ўстановы ці не.

Наталля ТАЛІВІНСКАЯ.
Фота Таццяны ТКАЧОВАЙ.

Наш фармат

НЕ СТАВІЦЬ ТВОРЧАСЦЬ НА ПАЎЗУ

Вядомы ў Беларусі дзіцячы калектыў — творчая майстэрня эстраднага мастацтва «Хвілінка» — падвёў вынікі інтэрнэт-конкурсу «Сэрцы ва ўнісон», які прайшоў у межах акцыі Беларускага рэспубліканскага саюза моладзі «Беларусь помніць» і быў прысвечаны 75-годдзю Перамогі.



Конкурс, у якім прымалі ўдзел юныя артысты калектыву ва ўзросце ад 6 да 22 гадоў і старэйшыя, меў на мэце не проста аддаць даніну павагі і памяці ўдзельнікам Вялікай Айчыннай вайны, якія набліжалі агульную Перамогу, але і захаваць пераемнасць пакаленняў — здзейсніць праз мастацтва патрыятычнае выхаванне дзяцей і падлеткаў. Так, кожны ўдзельнік (а іх набралася каля двух дзясяткаў) не проста запісаў на відэа і выклаў у Instagram патрыятычную песню ці харэаграфічную кампазіцыю з рэпертуару шоу-тэатра «Хвілінка», а прысвяціў гэту работу свайму блізкаму, які прымаў удзел у баявых дзеяннях ці працаваў у тыле, і расказаў пра сваяка з дапамогай здымкаў і ўспамінаў з сямейнага архіва.

З пастаўленай задачай дзеці справіліся на «выдатна». Як расказала «Звязде» з ноткай гонару за сваіх выхаванцаў **заснавальніца і мастацкі кіраўнік тэатра Таццяна ПАНОВА,** дарослае журы — харэографы, педагогі па вакале, прафесіяналы з Маладзёжнага тэатра эстрады, прадстаўнікі БРСМ — прыйшло ад дзіцячых ролікаў у сапраўднае захапленне. «Напэўна, самыя нізкія адзнакі з усіх былі мае, бо я заўжды самы строгі крытык для сваіх дзяцей. І тым не менш аказалася, што ў нас няма ніводнага дыпламанта — усе лаўрэаты!» — зазначае Таццяна Мікалаеўна.

Дыпломы атрымалі нават тыя ўдзельнікі, якія не ўкладліся ў адведзены хранаметраж. Арыяна і Дзіяна Рабыя з Кобрына, мама і дачка (малой, між іншым, усяго чатыры гады!), былі адзначаны спецыяльным прызам «За ўнёсак у маральна-патрыятычнае выхаванне дашкольнікаў сродкамі вакальнага мастацтва і творчую ініцыятыву», а Ульяну Марцову ўзнагародзілі дыпломам «За распрацоўку тэмы гераічнага мінулага». Спецыяльны прыз ад Беларускага рэспубліканскага саюза моладзі за найлепшае адлюстраванне патрыятычнай тэматыкі атрымае 7-гадовая Кіра Дулькевіч — дзяўчынку плануюць запрасіць на вочнае ўзнагароджанне разам з сям'ёй, каб падзякаваць і ёй, і бацькам.

Галоўная інтрыга, канешне, была вакол Гран-пры — іх журы прысудзіла найлепшым удзельнікам, дакладней, удзельніцам у намінацыях «Вакал» і «Харэаграфія». Праз танец выразней за ўсіх данесла свае пачуцці 17-гадовая Юлія Кондрусь, а ў вакальным плане ўразіла прафесіяналаў 9-гадовая Маргарыта Урублеўская, якая здолела а капэла так па-майстэрску выканаць складаныя нумары, што суддзі аднагалосна назвалі дзяўчынку пераможніцай. Абедзвюх уладальніц Гран-пры, якія ўжо атрымалі свае віртуальныя дыпломы, чакае яшчэ адзін памятны сюрпрыз ад арганізатараў — адмысловыя кубкі з эмблемай конкурсу, якія будуць уручаны дыстанцыйна, з дапамогай кур'ерскай дастаўкі.

...Дарэчы, дыстанцыяванне не прымусіла педагогаў і навучэнцаў «Хвілінкі» паставіць заняткі на паўзу. Вось ужо другі месяц творчая майстэрня, якая налічвае сёння больш за 80 вучняў, працягвае працаваць анлайн. Нават зусім новую «Песню пра Новарасійск», з якой шоу-тэатр упершыню выступіў сёлета ў святочным канцэрце на Дзень Перамогі, амаль цалкам падрыхтавалі менавіта ў анлайн-фармаце, а цяпер, як музычную мазаіку, збіраюць такім чынам кампазіцыю «Вясна Перамогі», якую калектыў прадставіць да Дня Незалежнасці.

— А як інакш? — здзіўляецца мастацкі кіраўнік шоу-тэатра «Хвілінка». — Для таго, каб усе былі спакойныя і здаровыя і ў той жа час маглі працягваць заняткі, давялося шукаць новыя ідэі і методыкі. Пытанне адмены мы проста не разглядалі, бо і бацькі, і самі дзеці, хто вывучае ў нас эстрадная мастацтва, — вельмі матываваныя, сярод іх няма «выпадковых», усе, нават самыя маленькія з падрыхтоўчай групы «Хвілінка Старт», ведаюць, навошта ім гэта патрэбна.

На «дыстанцыю», расказвае Таццяна Мікалаеўна, перайшлі і падрыхтоўчыя групы, у якіх дзеці ад 5 гадоў атрымліваюць пачатковыя навыкі па вакале і харэаграфіі, і ўжо загартаваны сцэнай канцэртны састаў, і група «Хвілінка Smile», так званы перадканцэртны састаў, удзельнікі якога час ад часу выступаюць у творчых праектах. Дадатковы элемент, прыдуманы ў «Хвілінцы» — візуалізацыя. Гэта значыць, што дзеці не толькі развучваюць тэорыю і практыку вакалу, танца, акцёрскага майстэрства, але і малююць іх у спецыяльных папках — напрыклад, настрой той ці іншай песні, харэаграфічныя пазіцыі. А яшчэ ёсць вясёлае прывітанне і развітанне, якія задаюць добры настрой на ўсіх занятках, сістэма эстафетнай перадачы заданняў, якая не дазваляе нікому біць лыжы, выстаўленне ацэнак адзін аднаму самімі дзецьмі, — усіх цікавінак не пералічыць.

Каб падрыхтавацца як след да такіх заняткаў, педагогі выдаткоўваюць нашмат больш часу, чым раней, але высілкі ўзнагароджваюцца шчырай падзякай вучняў і іх бацькоў. «Гэта дае магчымасць псіхалагічнага росту, бо можна, разгарнуўшы на маніторы выяву, убачыць усю групу, паглядзець на самога сябе збоку і параўнаць з іншымі, — заўважае Таццяна Панова. — Проста на вачах бачна, як дзеці пасталелі за гэты час, як уцягнуліся ў работу бацькі, якія атрымалі магчымасць «папрысутнічаць» на кожным уроку. Канешне, сістэма працуе толькі там. дзе ёсць у добрым сэнсе жорсткі педагагічны кантроль за арганізацыяй заняткаў. Прынамсі, у нас яна рэальна дзейнічае, і я проста ганаруся тым, як развіваюцца, працуюць над сабой і дасягаюць пастаўленых мэт нашы дзеці».

Вікторыя ЦЕЛЯШУК.
Фота дадзена шоу-тэатрам «Хвілінка».

МОДНЫ РАСКЛАД

Як аднаўляецца сусветная fashion-індустрыя?

У справаздачы аддзела па міжнародным гандлі ААН за першы квартал 2020-га адзначаецца, што сусветная прамысловасць ужо страціла не менш чым 50 мільярдаў долараў, з якіх $1,5 млрд прыйшлося на модную індустрыю. Аднак чаканыя страты перавышаюць гэтыя паказчыкі ў сотні разоў. Вядома, па выніках другога квартала, на які прыпадае значная частка каранціну, лічбы будуць яшчэ больш песімістычныя. Паводле даследавання кампаній Bernstein і Boston Consulting Group, страты ў свеце моды ацэньваюцца ў дзясяткі мільярдаў еўра. Журналісты The New York Times прадбачаць, што затрымкі ў вытворчасці і пастаўках могуць прывесці да пустых паліц у амерыканскіх крамах. З імі згодныя аналітыкі выдання WWD і падводзяць да думкі, што моднай індустрыі прыйдзецца глабальна перагледзець свае стратэгіі і лагістычныя схемы. Як і галоўнае — калі здолее аднавіцца сусветны fashion-рынак?

ЧАС УСХОДУ

Як сцвярджаюць эксперты, да канца XIX стагоддзя fashion-індустрыя адсутнічала, хоць сама мода як сацыяльны феномен вядомая з антычных часоў. Справа ў тым, што пакуль узровень жыцця асноўнай масы насельніцтва заставаўся нізкі, спажыванне абмяжоўвалася прадметамі першай неабходнасці з чыста функцыянальнымі ўласцівасцямі. Модныя тавары (ювелірныя ўпрыгажэнні, вытанчаную вопратку) куплялі нешматлікія арыстакраты і багацеі. У перыяд прыкладна з 1890-х да 1960-х адпаведная сфера паступова ператвараецца з дробнага бізнесу ў масавую вытворчасць і становіцца індустрыяй. Яшчэ ў сярэдзіне XIX стагоддзя з'явіліся спецыяльныя часопісы, якія расказвалі пра тэндэнцыі бягучага сезона і асартымент модных крамаў (аб тым, што «носяць у Парыжы»).

У 1950—1960-я, у перыяд фарміравання ў развітых краінах грамадства масавага спажывання, складваецца сістэма прагназавання. З'яўленне фірмаў, якія спецыялізуюцца на аналізе тэндэнцый развіцця моды, звязана з тым, што масавая вытворчасць гатовага адзення патрабавала прымаць маштабныя і доўгатэрміновыя рашэнні аб вытворчасці і закупках. Напрыклад, для таго каб на прылаўку з'явілася сукенка моднага колеру, актуальнай фактуры і арыгінальнага фасону, трэба было за тры гады да гэтага ўнесці змены ў тэхналогію вырошчвання бавоўны і адначасова стварыць формулу для вытворчасці фарбавальніка будучага палатна. Таму ўзнікла сістэма прагназавання, якая прадказвала змяненне дамінуючай тэндэнцыі.

Пачынаючы з гэтага перыяду эканоміка моды падзялілася на два ўзроўні — модных тавараў міжнароднага ўзроўню (такія як Ісі Міяке, Ёшы Ямамота), сусветна вядомым парыжскім куцюр'е стаў японец Кендза Такада. Чакаецца, што ў перспектыве ўздзеянне ўсходняй культуры будзе расці.

ВЫТВОРЦЫ І КАНТРАКТАРЫ

Кампаніі, якія займаюцца вытворчасцю, продажам і абслугоўваннем моднай прадукцыі, уяўляюць сабой гіганцкую індустрыю, якая дае шматмільярдныя даходы, але патрабуе вельмі буйных інвестыцый. Па некаторых ацэнках, з пачатку 2000-х індустрыя моды займае 5-е месца сярод найбольш капіталаёмістых галін сучаснай эканомікі. У сучаснымЦяпер у свеце — фарміраванне і распаўсюджванне ўяўленняў аб тым, што лічыцца модным, даўно перастала быць стыхійным і стала важнай галіной эканомікі (часткай маркетынгу — рэкламы і PR).

тавары «ад куцюр» (індывідуальныя заказы для эліты) і «прэт-а-партэ» (масавая вытворчасць для сярэдняга класа). Менавіта 1960—1980-я сталі эпохай легендарных парыжскіх куцюр'е — Како Шанэль, Крысціяна Дзіёра, Іва Сен-Ларана, Юбера Жываншы. З 1990-х у fashion-індустрыі пануе «плюралізм», калі цяжка казаць аб якім-небудзь адзіным дамінуючым стылі, тэндэнцыі падзяліліся на мноства трэндаў. Паралельна з гэтым нарастае хуткасць змяненняў, паколькі інфармацыя аб навінках імгненна распаўсюджваецца дзякуючы новым сродкам камунікацыі. Калі раней індустрыя арыентавалася на дарослых і заможных пакупнікоў, то да канца стагоддзя мода прыкметна «памаладзела». Нарэшце, адбылося зніжэнне ролі таленавітых стылістаў — цяпер тон задаюць не столькі таленавітыя дызайнеры і не столькі сталіцы мод (як Парыж, Лондан і Нью-Ёрк), колькі фірмы-вытворцы, якія прапагандуюць вядомыя брэнды.

Індустрыя моды фарміравалася як феномен заходнееўрапейскай цывілізацыі, і аж да канца мінулага стагоддзя яе не закраналі іншакультурныя ўплывы. Глабалізацыя прывяла не толькі да трансляцыі еўрапейскай моды па ўсім свеце, але і да пранікнення ў гэтую індустрыю ўплыву краін Усходу. У Японіі з'явіліся вытворцы

Змены ў стылях адзення становяцца вядомыя за паўгода да яго з'яўлення ў крамах, калі па выніках спецыяльных дэманстрацый новых узораў журналісты-аналітыкі паведамляюць пра навінкі і асноўныя тэндэнцыі маючага адбыцца сезона. У гэты ж час у ходзе «шоу-румаў» (прэм'ерных дэманстрацый) прадстаўнікі гандлёвых фірмаў робяць заказы на калекцыі для крамаў. І толькі сабраўшы ўвесь пакет заказаў, вытворцы гатовага адзення пачынаюць вырабляць калекцыі масавым тыражом.

Вытворцы моднай прадукцыі падзяляюцца на дзве групы: прамыя вытворцы і кантрактары. Прамыя вытворцы — гэта кампаніі (як, напрыклад, Levi Strauss and Co. у ЗША), якія ствараюць уласныя гандлёвыя маркі, распрацоўваюць мадэлі, калекцыі і затым вырабляюць іх на ўласных прадпрыемствах. Буйных кампаній такога тыпу вельмі мала. Часцей за ўсе кампаніі, якія самі «выходзяць» і самі вырабляюць усю калекцыю цалкам, займаюцца дробнасерыйнай вытворчасцю з вырабамі абмежаванага асартыменту і невялікага тыражу.

Большасць жа буйных вытворцаў адзення і аксесуараў аддаюць перавагу ўкладанню сіл толькі ў фарміраванне мадэляў. Вытворчасцю ўласна гатовых вырабаў займаюцца прадпрыемствы-выканаўцы, кантрактары. Калі распрацоўкай мадэляў адзення займаюцца ў асноўным спецыялісты з ЗША і Заходняй Еўропы, то іх выраб ажыццяўляецца часцяком у краінах, якія развіваюцца, з таннай рабочай сілай.

Акрамя даходаў ад вынаходкі новых мадэляў і іх вытворчасці прыбытак атрымліваюць ад продажу ліцэнзій — правоў на выкарыстанне лагатыпа «моднай» фірмы на неканкурэнтнай прадукцыі іншых кампаній. Піянерам ліцэнзійнага бізнесу ў індустрыі моды лічыцца Pierre Cardin. Фэшн-індустрыя характарызуецца найбольш высокай незалежнасцю кошту тавараў ад іх аб'ектыўнай спажывецкай каштоўнасці. Каштоўнасць брэнда існуе толькі ў свядомасці спажыўцоў. Таму львіная доля сабекошту модных тавараў прыпадае менавіта на рэкламу і PR, а не на ўласна вытворчыя выдаткі.

СПРАВА НА 2,5 ТРЫЛЬЁНА ДОЛАРАЎ

Па выніках мінулага года аб'ём сусветнай fashion-індустрыі склаў 2,5 трыльёна долараў, адзначаецца ў сумесным даследаванні McKinsey і The Business of Fashion. Эксперты лічаць, што з-за крызісу, выкліканага пандэміяй COVID-19, у цэлым па свеце сярэдняя рынкавая капіталізацыя гульцоў, якія спецыялізуюцца на вытворчасці і продажы адзення, абутку і аксесуараў, ужо звалілася на 40 працэнтаў. Наступствы гэтага крызісу могуць быць супастаўныя з эканамічным спадам часоў Другой сусветнай вайны, папярэджваюць аналітыкі. Эксперты McKinsey і The Business of Fashion прагназуюць, што па выніках 2020 года аб'ём выручкі ўсяго міжнароднага рынку моды скароціцца на 30 працэнтаў, у сегменце luxury падзенне складзе да 39 %.

Негатыўны ўплыў на рынак акажа падзенне рэальных даходаў пакупнікоў. Да 75 % апытаных спажыўцоў ЗША і ЕС згаджаецца, што ў найбліжэйшыя два месяцы іх фінансавае становішча будзе станавіцца толькі горшым і яны адмовяцца ад пакупак тавараў, якія не ўваходзяць у спіс першачарговых. У выпадку калі крамы адзення будуць зачыненыя на працягу двух месяцаў, як мінімум 80 % публічных кампаній, зарэгістраваных у Еўропе, чакае фінансавая катастрофа, прагназуюць аналітыкі McKinsey і The Business of Fashion. Яны прадракаюць банкруцтва адразу шэрагу буйных транснацыянальных карпарацый на рынку моды ў наступныя паўтара года.

За тры месяцы абмежаванняў, звязаных з каранавірусам, 3,5 мільярда еўра страціла fashion-індустрыя толькі Італіі — краіны, дзе сканцэнтраваны культавыя для мільёнаў людзей свету модныя дамы. Настолькі ўпалі продажы ў параўнанні з аналагічным перыядам мінулага года. Удзельнікі рынку мяркуюць, што да канца года гэтая лічба складзе каля дзевяці мільярдаў еўра.

Калі 10 красавіка прэм'ер-міністр Італіі Джузэпэ Контэ падоўжыў каранцін у краіне, прадстаўнікі Палаты моды і іншых аб'яднанняў, звязаных з моднай індустрыяй, апублікавалі адкрыты ліст у штодзённай газеце La Repubblica. Па словах старшыні палаты Карла Капасы, старонняму назіральніку можа быць незразумела, як працуе fashion-індустрыя і што яе асаблівасцю з'яўляюцца доўгія вытворчыя цыклы. «Калі вытворчасць не адновіцца да 20 красавіка, у нас не застанецца часу, каб адшыць асенне-зімовыя калекцыі, якія трэба разаслаць па ўсім свеце ўжо да ліпеня, — заявіў ён. — Мы не зможам зрабіць калекцыі сезона вясна-2021. З-за затрымкі брэнды не змогуць падрыхтавацца да паказаў у верасні».

Ён таксама адзначыў, што дзяржава павінна выратаваць fashion-індустрыю Італіі «не толькі для нас, але і для будучых пакаленняў», а таксама нагадаў, як частка ланцужка паставак і вытворчасці была ператворана «ў рэкорднa кароткія тэрміны» для выпуску масак і медыцынскага спецадзення. У лісце адзначалася, што Італія з'яўляецца найбуйнейшым вытворцам раскошных модных тавараў у свеце і лідарам па стварэнні тэкстылю, адзення, абутку і аксесуараў сярод краін Еўропы. У італьянскай моднай індустрыі задзейнічана 600 тысяч працоўных. «Ці гатовыя мы страціць індустрыю, якая стала сімвалам краіны?» — завяршыў свой зварот Капаса.

Заклік пачулі, і галіна стала адной з першых на Апенінах, дзе пачалі адмяняць абмежаванні, якія былі ўведзены з-за пандэміі. Фэшн-індустрыю на Апенінах нярэдка называць «італьянскай нафтай». Менавіта высокую моду і вытворчасць прадметаў раскошы тут лічаць лакаматывам, які выцягне іх краіну з крызісу. Аднак на гэта спатрэбіцца доўгі час. Аналітыкі перакананыя: каб у цэлым галіна вярнулася да ўзроўню 2019-га, спатрэбіцца не менш за чатыры гады.

РЭЦЭПТ АД АРМАНІ

Выходзячы на рынак пасля зняцця абмежаванняў, многія прадстаўнікі фэшн-галіны заяўляюць аб неабходнасці, па меншай меры, на час, змяніць бізнес-мадэль, прычым не толькі ў кожнай асобна ўзятай кампаніі, але і ва ўсёй індустрыі. Як заўважаюць эксперты, пасля беспрэцэдэнтна доўгага разрыву паступленняў ад продажаў варта максімальна знізіць рызыкі нестабільнасці грашовага патоку. Цяпер ідзе пошук сродкаў дасягнення гэтай мэты, адзначае expert.ru. Канчатковыя рашэнні павінны паспець да сярэдзіны ліпеня, калі звычайна модныя дамы прадстаўляюць калекцыі на сезон 2020/2021.

Галоўнае, чаго хочуць кампаніі фэшн-індустрыі, — максімальна дакладна трапіць у рамкі попыту, які прад'явіць спажывец. Адзін з варыянтаў такога падыходу — скараціць у сезоне 2020/2021 гадоў колькасць пазіцый у калекцыях — са звычайных да гэтага часу 500 да 200—280. Як відаць, мода цяпер не будзе такой хуткай, адзначае expert.ru. Калекцыі не будуць прасоўваць рытэйлерам кожныя 15 дзён, як гэта ўжо ўвайшло ў правіла.

Для таго каб не дапускаць перавытворчасці і наблізіцца да рэальных памераў попыту, 600 дызайнераў усяго свету падпісалі адкрыты ліст, які заклікае модную індустрыю і рытэйл перагледзець паняцце сезоннасці ў ланцужку, наблізіць яе да рэальнай змены пораў года. Так склалася, што асенне-зімовыя рэчы траплялі на паліцы крамаў сярод лета, у ліпені, а вясновыя і летнія — у разгар зімы, у студзені. Цяпер жа прапануецца зрушыць гэтыя тэрміны — адпаведна на канец жніўня і люты.

Як лічыць прэзідэнт кампаніі Dondup Матэа Марзота, усё ж нішто не заменіць у моднай індустрыі афлайн-крамы: «Лічбавізацыя дае нам вялікія магчымасці, але фэшн складаецца з фізічных аб'ектаў. Рабіць пакупкі ў прыгожай краме або прысутнічаць на модным паказе — такі ж кайф, як глядзець футбольны матч на стадыёне або па тэлебачанні». Так што, хутчэй, лічбавізацыя будзе крытычнай для вытворчага працэсу. Неабходнасць не дапускаць перавытворчасці, дакладна ўлічваючы попыт, прывядзе да развіцця сістэм «пад запыт» з ужываннем прарыўных тэхналогій інтэрнэту рэчаў.

Паводле прагнозу Boston Consulting Group, запыты спажыўцоў пасля Вялікага лакдаўну будуць кардынальна адрознівацца ад дакаранцінных. Спажыўцы ў ЗША і Еўропе стануць разглядаць куплю адзення хутчэй як пэўныя інвестыцыі, а не пагоню за моднымі трэндамі. Яны будуць набываць рэчы, якія праслужаць доўга і не будуць за адзін сезон губляць ярлык «модна». Сусветна вядомы дызайнер Джорджыа Армані ўпэўнены, што гэты крызіс — выдатны час, каб перагледзець саму сутнасць сістэмы, яе графік. «Прыбыткі не павінны надалей заставацца асноўным арыенцірам для стваральнікаў раскошы», — адзначыў куцюр'е ў інтэрв'ю газеце La Repubblica.

Захар БУРАК.

О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

Государственное предприятие
«Минский областной центр инвестиций и приватизации»
(организатор аукциона)
по поручению ОАО «Слуцкий комбинат хлебопродуктов»
(продавец)
проводит повторный открытый аукцион
по продаже имущества элеватора в составе:

1. НЕДВИЖИМОЕ ИМУЩЕСТВО:

верхняя соединительная галерея с инв. № 602/С-37571, общей площадью 199,1 кв. м;
кабельная линия 10 кв. № 12 с инв. № 602/С-37786;
внешние сети водопровода с инв. № 602/С-37793;
